

РЫЧАГІ ДЛЯ ДАЎГАБУДАЎ **5**

САКРЭТЫ ХЛЕБАПЁКА **20**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ЛІПЕНЯ 2021 г.
ПЯТНІЦА
№ 129 (29498)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
+TV ПРАГРАМА

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў:**

*«Актуалізацыя заканадаўства аб садаводчых таварыствах наспела даўно з улікам сучасных рэалій. Сёння ў краіне дзейнічае каля пяці тысяч садаводчых таварыстваў, якія аб'ядноўваюць больш за 500 тысяч садаводаў, і гэта вельмі вялікая колькасць. А калі яшчэ сюды дадаць членаў сем'яў, то мы выйдзем за лічбу прыкладна ў паўтара мільёна. У цяперашні час прававыя адносіны ў садаводчых таварыствах рэгулююцца шэрагам нарматыўных актаў, якія шмат у чым устарэлі і не вырашаюць цэлы шэраг пытанняў, што ўзнікаюць на практыцы. Менавіта для ўрэгулявання спрэчных сітуацый дэпутатамі было ініцыіравана стварэнне міжведамаснай рабочай групы, задачамі якой стала выяўленне «вузкіх месцаў» у заканадаўстве, якія не даюць магчымасці забяспечыць эфектыўнае функцыянаванне садовых таварыстваў, паўнавартасна забяспечыць правы і законныя інтарэсы грамадзян».*

# ДЗЯВОЧАЕ ХОБІ



Такіх вось незвычайных рыбакоў убачыў наш фатограф Анатоль КЛЯШЧУК на Святым возеры ў Верхнядзвінскім раёне.

**КОРАТКА**

• **Іван Ціхан абраны капітанам алімпійскай зборнай Беларусі на Гульні ў Токіа.**



• Белстат апублікаваў выніковыя даныя сельскагаспадарчага апытальніка перапісу 2019 года: у карыстанні грамадзян знаходзіцца 2253,1 тыс. зямельных участкаў агульнай плошчай 359,7 тыс. га.

• **Кулінарны фестываль «Мотальскія прысмакі» правядуць 7—8 жніўня.**

Надзённае

## ТОЛЬКІ Б НЕ ЗАХВАРЭЦЬ

### На папулярным у горадзе рынку «Лагуна» брэсцкага мікрараёна Кавалёва працуе стацыянарны прышчэпачны пункт



Урач Людміла ЧАСНАКОВА аглядае пацыентку.

**Кожныя 15 хвілін апаратар радыёвузла рынку аб'яўляе, што ў першым радзе гандлёвых радоў працуе стацыянарны прышчэпачны пункт, дзе можна зрабіць прышчэпку ад COVID-19. Голас з дынаміка ўдакладняе, што працэдура бясплатная, і запрашае супрацоўнікаў і наведвальнікаў «Лагуны» прайсці вакцынацыю ад небяспечнай хваробы.**

Каля павільёна, дзе размяшчаецца прышчэпачны пункт цэнтральнай паліклінікі абласнога цэнтра, не сказаць, што шматлюдна, але людзі пакрысе ідуць. У выхадныя, кажуць, тут доўгія чэргі стаялі. А вось у аўторак (6 ліпеня. — **Аўт.**) на рынку самы небагаты на пакупнікоў дзень. Таму любы ахвотны можа спакойна зайсці на прыём да ўрача і без усялякай чаргі прайсці працэдуру вакцынацыі. Так і зрабіла Валянціна Пятроўна, жыхарка аднаго з дамоў па вуліцы Суворава.

**СТАР. 4**

На слыху

## АДХОДЫ Ў ДАХОДЫ

### Пакінуць на звалцы ці перапрацаваць?

**Як сведчыць статыстыка, апошнім часам гадавы вываз цвёрдых бытавых адходаў з населеных пунктаў павялічыўся ў два разы. Прычына — кароткі тэрмін выкарыстання бытавых рэчаў з пластыку, поліэтыленавых пакетаў, упакоўкі, тары і іншага. Штогод беларусы спажываюць да чатырох мільярдаў фасовачных пакетаў, 200 мільёнаў аднак аднаразовага пластыкавага посуду. Ці магчыма выправіць становішча і пры гэтым захаваць камфорт для людзей? Вядома, можна. Неабходна вяртаць адходы ў вытворчасць.**

Па інфармацыі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у Беларусі вымаецца крыху больш за 22 % другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР) з цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА). За апошнія гады дадзены паказчык вырас больш чым удвая. Аднак у гэтым кірунку Беларусь адстае ад еўрапейскіх краін. Сярод асноўных прычын — недахоп ліній па выманні другасных матэрыяльных рэсурсаў.

Але сітуацыя з абаротам адходаў з цягам часу мяняецца да лепшага. Пра гэта сведчыць праект, які ажыццяўляецца на тэрыторыі Пухавіцкага раёна. Ён прадугледжвае стварэнне сучаснага палігона ЦКА еўрапейскага ўзроўню. І рэалізоўваецца пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР) — сума пазыкі 5 мільёнаў еўра, а таксама рэгіянальнага фонду Усходнееўрапейскага партнёрства па пытаннях энергаэфектыўнасці і экалогіі — сума грантавых сродкаў — 2 мільёны еўра, расказала **начальнік аддзела ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Мінаблвыканкама Кацярына САЛАЎЁВА.**

**СТАР. 5**

ISSN 1990 — 763X
21129>

З першых вуснаў

# «МЫ ВЕДАЕМ ЦАНУ МІРУ»

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел ва ўрачыстай цырымоніі ўшанавання выпускнікоў вышэйшых ваенных навучальных устаноў і вышэйшага афіцэрскага саставу. Гэту сустрэчу ў Палацы Незалежнасці Прэзідэнт назваў падзеяй дзяржаўнай важнасці. Па яго словах, афіцэрскі корпус — гэта апора бяспекі дзяржавы. А ў сучасных умовах асабліва значэнне набываюць вернасць абавязку, інтэлект і прафесійныя веды.**

«Бачу ў вас я і афіцэраў-патрыётаў, людзей гонару і абавязку, і высакакласных спецыялістаў, камандзіраў і начальнікаў, здольных супрацьстаяць любым агрэсіўным дзеянням у дачыненні да Беларусі. Асабліва гэта актуальна ў святле таго, што ў цяперашні час адбываецца вакол краіны і ў свеце ў цэлым. ***На нашых вачах крок за крокам, паслядоўна руйнуецца архітэктура міжнароднай бяспекі. А калі прама сказаць, яе ўжо не існуе»,*** — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што шматбаковыя сусветныя пляцоўкі, закліканыя падтрымліваць мір і бяспеку на планеце, відавочна, дэградуюць і дэманструюць няздольнасць эфектыўна выконваць свае функцыі. Ён заўважыў, што абвастраецца геапалітычная напружанасць паміж Усходам і Захадам, і стратэгічнае саперніцтва ўлад пагражае перайсці ў іншую, больш небяспечную, фазу. Назіраецца пастаяннае ўзмацненне наступальнага патэнцыялу Паўночнаатлантычнага альянсу. Множацца эканамічныя санкцыі і дыскрымінацыйныя меры палітычнага характару. «Выснова відавочная. ***Калектыўны Захад працягвае імкнуцца да ўсталявання сваёй гегемоніі і не адмаўляецца ад спроб пазбавіць нас суверэнітэту і навязаць знешняе кіраванне»,*** — канстатаваў беларускі лідар.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, самае сумнае, што ўсё гэта адбываецца ў год 80-годдзя пачатку самай крывавай вайны. «Мы гатовыя да сумленнага раўнапраўнага дыялогу. ***Мы не хочам ваяваць, у нас няма такой мэты.*** Мы людзі ваенныя, і мы ведаем цану міру. Але мы не ўстанем на калені. Мы не можам зрабіць тое, што яны хочуць. ***Мы абараняем сябе, свае сем'і, сваіх дзяцей, сваю зямлю. І мы больш нічога не жадаем»,*** — сказаў ён.

## Ваенныя добра сябе зарэкамендавалі

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што Беларусі ёсць чым адказаць тым сілам, якія спрабуюць гуляць мускуламі на заходніх межах. З гэтай мэтай развіваецца ваенная арганізацыя дзяржавы, аснову якой складаюць Узброеныя Сілы. Беларуская армія мабільная і добра аснашчаная, здольная супрацьдзейнічаць сучасным выклікам і пагрозам. А яе галоўная каштоўнасць — гэта людзі, для якіх абарона Беларусі — прафесія і сэнс жыцця.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што прадстаўнікі ўсіх сілавых ведамстваў прайшлі жорсткую праверку на працягласць летам-восеннем мінулага года. Па яго словах, яна паказала, што створаная нацыянальная сістэма бяспекі вытрымала выпрабаванне. Людзі ў пагонах, праявіўшы мужнасць, стойкасць, вернасць прысязе і народу, выстаялі.

«Тэарэтычна мы рыхтуемся да вайны, не так, як гэта было раней. ***Вы выдатна разумееце, што вайна не пачнецца з агрэсіі звонку. Яна пачнецца ўнутры краіны з разбурэння розумаў нашых людзей. Пачнецца з таго, каб пасеяць хаос у нашай краіне і ўжо потым, калі спатрэбіцца, увесці сюды замежныя войскі»,*** — сказаў Прэзідэнт, дадаўшы, што супрацьстаянне гэтаму — сутнасць нашай канцэпцыі нацыянальнай бяспекі. «І павінен вам прама сказаць, што ваенныя ў мінулым годзе зарэкамендавалі сябе вельмі добра. І іншыя сілавыя структуры», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

## Гэта місія, жыццёвы шлях

Звяртаючыся да выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што яны здольныя ўнесці свой уклад ва ўмацаванне ваеннай арганізацыі дзяржавы. І для гэтага трэба будзе павышаць вывучку і зладжанасць органаў кіравання і войскаў, навучаць падначаленых сучасным спосабам вядзення ўзброенай барацьбы. Сур'ёзным экзаменам на прафесійную сталасць для афіцэраў ужо ў найбліжэйшы час стане сумеснае стратэгічнае вучэнне Узброеных Сіл Беларусі і Расіі «Захад 2021», якое стане чарговым значным крокам у падрыхтоўцы Узброеных Сіл і ўдасканаленні дзеючай сістэмы забеспячэння ваеннай бяспекі дзяржавы.

***«Галоўная задача супрацоўнікаў органаў унутраных спраў — забеспячэнне грамадскага парадку ў краіне. Прыярытэтамі тут застаюцца далейшае павышэнне ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі пры выкананні задач у асаблівых умовах, захаванне законнасці і справядлівыя адносіны да грамадзян»,*** — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу на дзейнасць сістэмы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Ён падкрэсліў, што неабходна засяродзіцца на павышэнні эфектыўнасці работы па папярэджанні пажараў, аварый і прадухіленні гібелі людзей ад іх.

Звяртаючыся да выпускнікоў-пагранічнікаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ім варта забяспечыць надзейную абарону і ахову дзяржаўнай граніцы. ***«З улікам нарастання ваеннай актыўнасці каля граніц Беларусі, павелічэння колькасці правакацый з боку сумежных дзяржаў, росту трансгранічнай злачыннасці неабходна падтрымліваць высокі ўзровень баявой гатоўнасці і падрыхтоўкі асабовага складу, своечасова выяўляць і спыняць супрацьпраўную дзейнасць на памежжы»,*** — сказаў ён.

Асноўнымі задачамі афіцэраў спецслужбаў кіраўнік дзяржавы назваў своечасовае выяўленне падрыхтоўкі актаў — тэрарызму, экстрэмізму, масавых беспарадкаў, нацыянальнай і рэлігійнай варожасці, прыняцце мер па іх нейтралізацыі, а таксама прадухіленне спроб прычынення дэструктыўнымі сіламі шкоды эканоміцы і іншым сферам дзейнасці дзяржавы і забеспячэнне мірнага, стваральнага жыцця ў нашай краіне.

## «Дзявацца нам няма куды»

Падчас урачыстай цырымоніі былі ўручаны і генеральскія пагоны. Як адзначыў Прэзідэнт, у Беларусі генеральскіх пасад няшмат, і атрыманне такога звання з'яўляецца найвышэйшым дасягненнем у службе ваеннага чалавека і найвялікшым гонарам.

«Таварышы генералы, ганарыцеся гэтым званнем і з гонарам насіце яго. А вы, паважаныя выпускнікі, бярыце з іх прыклад годнага выканання службовага абавязку. І імкніцеся быць генераламі», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да прысутных.

Пасля цырымоніі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што шмат казаў пра задачы сілавых ведамстваў, але цяпер хацеў бы звярнуцца да іх па-мужчынску: «Дзявацца вам няма куды: у мінулым годзе вайскоўцы сілавых падраздзяленняў так высока ўзнялі планку дзеянняў па абароне нашай Айчыны, што ўтрымліваць яе на такой вышыні будзе няпроста. Але мы людзі ваенныя, яшчэ раз падкрэсліваю, дзявацца нам няма куды. Дзякуй вам за ўсё. Мужнасці, будзьце заўсёды сумленныя, не дапускайце ні ў якім разе здрады», — пажадаў беларускі лідар.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Не вашых пытанняў у Беларусі няма»

**Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назначыў Валерыя Іванова, які да гэтага часу ўзначальваў Белкаапсаюз, кіраўніком спраў Прэзідэнта Беларусі**

**«Мною прынята рашэнне аб назначэнні вас кіраўніком спраў Прэзідэнта. Пасада сярод 11 вышэйшых службовых асоб. Інакш кажучы, вы не проста кіраўнік спраў Прэзідэнта, але і будзеце дадаткова займацца пытаннямі як вышэйшая службовая асоба. Гэта значыць, што не вашых пытанняў у Беларусі няма. Яны ўсе вашы, дзе б вы ні хадзілі, што б вы ні рабілі», — звярнуў увагу беларускі лідар.**

Ён адзначыў, што гэта датычыцца ў тым ліку паўсядзённага жыцця: паход гэта ў магазін або наведванне таго ці іншага прадпрыемства. «Заўсёды для вышэйшых службовых асоб на кожным метры нашай Беларусі ёсць справа. Гэта не патэтыка, не гучныя фразы. Так павінны працаваць вышэйшыя службовыя асобы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што часу на раскачку няма: «Абстаноўку вы бачыце. Яна, дзякуй богу, не крытычная. Але нам ні ў якім разе нельга дапусціць крытычнасці гэтай абстаноўкі. Таму я зрабіў выбар зыходзячы з вашага вопыту... Вы заўсёды ішлі туды, дзе было цяжка, дзе трэба было навесці парадак. Я гэта вельмі цаню і я гэта ніколі не забуду».

«Але гэта не значыць, што будзе лёгка. Усе лічаць, што Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта — гэта тое, што Палац Незалежнасці і загарадная рэзідэнцыя Прэзідэнта. Ды не, Кіраўніцтва справамі — гэта велізарная махіна», — акцэнтаваў увагу беларускі лідар. Ён нагадаў, што ў свой час у веданне Кіраўніцтва справамі аддаваліся ў тым ліку найбольш праблемныя прадпрыемствы і арганізацыі, дзе існавала складаная сітуацыя.

Прэзідэнт сказаў, што праз некаторы час, калі новы кіраўнік увойдзе ў курс справы, трэба будзе сабрацца асноўным складам Кіраўніцтва справамі, уключаючы кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў, тых, каго звычайна запрашаюць на калегію ведамства, і абмеркаваць стратэгію работы на перспектыву. «Але пераканаўча прашу, каб вы дайшлі да кожнага прадпрыемства, паглядзелі на кіруючы склад. Абавязкова. Ад гэтага нікуды не дзецца», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Яшчэ адна задача, якую абазначыў Прэзідэнт, датычыцца спажыўкааперацыі. «Я, як мог, ратаваў спажыўкааперацыю. Пазіцыю вы маю ведаеце. Наколькі можна было яе ратаваць пры той жорсткай канкурэнцыі, мы яе захавалі», — сказаў ён.

Ён таксама звярнуў увагу на тое, што Валерый Іваноў прадоўжыць займаць пасаду ўпаўнаважанага прадстаўніка Прэзідэнта па Брэсцкай вобласці.

**Паводле БелТА.**

## Блізкая ўлада

# «ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ» Ў ГАРАЧЫНЮ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, **10 ліпеня, з 9.00 да 12.00,** праводзяць:

- намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- першы намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег Сяргеевіч МАЦКЕВІЧ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Ігар Мікалаевіч ЧАСНОК. Тэл. 8 023 233 12 37;
- старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч ЖУК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Васілевіч УЛАСЕВІЧ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Аляксандр Вікенцьевіч ДАРАХОВІЧ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп падаў у суд на Facebook, Google і Twitter за блакіраванне яго акаўнтаў



**Былы прэзідэнт ЗША Дональд Трамп падаў у акруговы суд штата Фларыда іск супраць трох тэхналагічных кампаній Facebook, Google і Twitter, а таксама іх генеральных дырэктараў, за блакіраванне яго акаўнтаў у сацыяльных сетках, паведамляе Deutsche Welle.**

У іскавых патрабаваннях Дональд Трамп просіць суд абавязаць адказчыкаў разблакіраваць яго акаўнты ў сацыяльных сетках. Акрамя таго, ён патрабуе «неадкладна спыніць дзейнасць сацыяльных сетак, незаконную ганебную цэнзуру амерыканскага народа». Дональд Трамп падкрэсліў, што не размежвае на міравое пагадненне, але спадзяецца, што працэс стане пераломным для ўсёй краіны.

Акаўнты Дональда Трампа ў Facebook, Instagram, YouTube і Twitter былі заблакіраваны ў студзені 2021 года, пасля таго як яго прыхільнікі, незадаволеныя вынікамі прэзідэнцкіх выбараў, уварваліся ў будынак Капітолія. Кіраўніцтва сацсетак вырашыла, што Дональд Трамп сваімі паведамленнямі патураў гэтай акцыі. У Twitter яго заблакіравалі назаўсёды, у Facebook прыпынілі работу акаўнтаў на два гады.

Ні адна з кампаній падачу іску з боку былога прэзідэнта пакуль не пракаментавала.

## У Кітаі забаранілі будаваць небаскробы вышэй за 500 м

**У Кітаі з меркаванняў бяспекі ўведзена забарона на будаўніцтва супер-небаскробаў вышынёй, большай за 500 м, паведамляе South China Morning Post.**

Па інфармацыі выдання, у Кітаі знаходзіцца амаль палова са 100 самых высокіх будынкаў свету. Улады краіны лічаць, што далейшае будаўніцтва шматпавярховікаў можа паставіць пад пагрозу бяспеку будынкаў, якія ўзводзяцца.

Акрамя таго, будаўніцтва небаскробаў ужо прывяло да перанасычэння рынку офіснай нерухомасці.

Абмежавана таксама ўзвядзенне будынкаў вышынёй, большай за 250 м, а збудаванні, вышэйшыя за 100 м, павінны будавацца такім чынам і ў такіх месцах, каб мець усе неабходныя рэсурсы для хуткага тушэння магчымага пажару.

## У ЗША жанчына выйграла мільён долараў у латарэі для вакцынаваных

**Мама чатырох дзяцей Хэйдзі Расэл з Каларада выйграла мільён долараў у латарэі для вакцынаваных ад COVID-19.**

У маі губернатар Джарэд Поліс аб'явіў аб розыгрышы, у рамках якога пяць прышчэпленых жыхароў штата змогуць выйграць такую суму.

Грошы возьмуць з федэральных сродкаў, выдзеленых штату для павелічэння ахопу імунізацыі. «Гэты прыз вельмі дапаможа выгадаваць чатырох дзяцей. Але я таксама спадзяюся, што з дапамогай гэтых грошай акажу дапамогу іншым», — перадае словы пераможніцы тэлеканал CBS.

Сумесны праект „Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ ЎБЯСПЕЦЫ!

# «ІСПЫТ» НА РЭАГАВАННЕ

## Маштабныя комплексныя вучэнні прайшлі ў Смалявіцкім раёне

**Калі на чыгуначнай станцыі «Смалявічы» загарэлася цыстэрна з палівам, пажарная сірэна завыла амаль адразу ж — на месца здарэння ратавальнікі прыбылі ў лічаныя хвіліны. Спачатку астудзіўшы вадой незакранутыя полымем цыстэрны, яны пачалі заліваць пенай ачаг узгарання. Пажар быў ліквідаваны. Супрацоўніка чыгункі, які да прыезду ратавальнікаў спрабаваў справіцца з агнём самастойна, перадалі ў рукі медыкаў. На шчасце, усё абышлося...**




Яшчэ лепш, што згаданая сітуацыя — не больш чым дэманстрацыя, арганізаваная з мэтай праверкі дзейнняў органаў кіравання і сіл дзяржаўнай сістэмы папярэджання і ліквідацыі надзвычайных сітуацый і грамадзянскай абароны падчас падобных надзвычайных здарэнняў. Такія «іспыты» на выкананне заканадаўства па пажарнай бяспецы і папярэджанні надзвычайных сітуацый, а таксама правіл паводзін у галіне прамысловай бяспекі кожны раён у Мінскай вобласці вытрымлівае раз на сем гадоў. Гэтымі днямі праверку на рэагаванне ў надзвычайных сітуацыях прайшоў Смалявіцкі раённы выканаўчы камітэт.

— Гэта знакавыя вучэнні, якія закранаюць вялікае кола людзей: задзейнічаны не толькі супрацоўнікі МНС, а і прадстаўнікі ўпраўлення ўнутраных спраў, дарожных арганізацый, Беларускай чыгункі, якія ў рэжыме надзвычайнай сітуацыі працуюць зладжана і аператыўна ліквідуюць усе наступствы, — адзначаў **намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта — старшыня камісіі па надзвычайных сітуацыях Мінскага аблвыканкама Аляксандр КРУЧАНАЎ.** — Мэта вучэнняў — узаемадзеянне органаў дзяржаўнага кіравання з падраздзяленнямі сістэмы Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, грамадзянскай абароны ў мірны час, а таксама ў асаблівых сітуацыях: пачынаючы ад штармавых папярэджанняў, надзвычайных сітуацый тэхнагеннага характару і заканчваючы мадэляваннем магчымых тэрарыстычных актаў. Лепш, каб нічога дрэннага не адбывалася, але мы ні ад чаго не застрахаваныя. Наша сістэма МНС сёння гатовая да ліквідацыі любых надзвычайных сітуацый.



На другім этапе першага дня вучэнняў дзеянні разгарнуліся ў раёне Пятровіцкага вадасховішча. Гарачае надвор'е прыцягнула мясцовых жыхароў да вады, таму на беразе, ды і ў самім вадаёме было шматлюдна. Адзін з адпачывальнікаў пачаў тануць. Сігнал ратавальнікам — і над вадой закружыўся верталёт МНС, з якога ў ваду спусціліся супрацоўнікі Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння «Зубр». Пацярпелага выцягнулі з вады з дапамогай каната, скінутага з борта вінтакрылай машыны.

На другім беразе (па легендзе вучэнняў, вядома) упаў лёгкаматорны самалёт. Для пошуку пацярпелых у неба ўзняўся верталёт Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, які над месцам авіякатастрофы высадзіў ратавальны «дэсант» разам з сабакамі — дзякуючы чатырохногім сябрам пошук людзей па часе значна скараціўся. На квадрацыклах, якія ў складзе пошукавай групы прыбылі на месца здарэння, пацярпелых у кароткі тэрмін даставілі да машын хуткай дапамогі, што ўжо чакалі каля вадаёма. Але пакуль дапамогу аказвалі людзям, ратаваць трэба было і экасістэму — агонь, які падчас гарачыні распаўсюджваецца імгненна, ахопліваў усё новыя і новыя ўчасткі сушы. На дапамогу зноў выляцеў верталёт. Ён чэрпаў ваду тут жа, з вадасховішча, — у выніку пажар быў патушаны.

А тым часам (зноў жа, па легендзе) у вадаём трапіў аўтамабіль — відаць па ўсім, уладальнік транспартнага сродку не справіўся з кіраваннем. У першую чаргу ратавальнікі-вадалазы выцягнулі з вады чалавека і, правёўшы яму сардэчна-лёгачную рэанімацыю, узяліся за аўтамабіль, які ўжо амаль схаваўся пад вадой. Затым з дапамогай спецыяльнага абсталявання ратавальнікі-хімікі пачалі ажыццяўляць збор нафтапрадуктаў з паверхні вадаёма.



Акрамя таго, у той жа дзень ратавальнікі, а таксама іншыя службы, адказныя за грамадзянскую абарону ў раёне, змагаліся з наступствамі абвальвання даху ў будынку выставачнага комплексу на тэрыторыі індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

На другі дзень сілы службаў Смалявіцкага раёна былі накіраваны на барацьбу з непагаддзю. У выніку моцнага ліўня быў падмыты аўтамабільны мост праз раку Пліса, што стварала пагрозу яго частковага разбурэння. Акрамя таго, моцны вецер прывёў да таго, што некалькі дрэў пры падзенні зачапіла апоры ліній электраперадачы — без электрычнасці застаўся адзін з населеных пунктаў. Медыцынская дапамога спатрэбілася і мясцоваму жыхару, які атрымаў траўму. Але і тут ратавальнікі разам з іншымі службамі раёна выдатна справіліся з наступствамі непагадзі.

У гэты ж дзень, згодна з легендай вучэнняў, была ліквідавана і аварыя з выкідам аміяку на прадпрыемстве «Смалявічы Бройлер», патушана ўзгаранне на мэблевай фабрыцы. Аварыйныя службы аператыўна адрэагавалі і на паведамленне аб уцечцы газу ў падвале аднаго з дамоў.

— У межах вучэння мы аналізуем гатоўнасць шматлікіх службаў раёна да рэагавання на магчымыя надзвычайныя сітуацыі, — паведаміў **першы намеснік начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Уладзімір ЯНЧЫК.** — Мы ацэньваем, наколькі аператыўна яны зрэагавалі, якія сілы і сродкі прыцягнулі, ці своечасова і правільна прынялі кіраўніцкія рашэнні. У дадзеным вучэнні мы адпрацоўваем сітуацыі, найбольш характэрныя для летняга перыяду: узгаранне ў экасістэмах, надзвычайныя здарэнні на вадзе. Мы гатовыя ліквідаваць любую надзвычайную сітуацыю. У нас для гэтага дастаткова сіл, сродкаў і вопыту работы.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.**

---

Надвор'е

# Не проста сярэдзіна лета...

### Калі на працягу тыдня ў нас было 32—34 цяпла, то ў наступныя аўторак і сераду, магчыма, расплавіць да плюс 35 градусаў?

**Хтосьці не верыць у глабальнае пацяпленне? Хай выходзіць на вуліцу, пастаіць некалькі хвілін на сонейку, упэўнены — паверыць. І калі ў мінулыя гады пацяпленне ў асноўным выяўлялася зімой (зімы як такой не было), то цяпер, пасля нармальнай зімы, наце вам супергарачае лета.**



Таму ў нас і будзе да канца тыдня (ды і далей) прыпякаць не на жарт. Так, лета ў разгары, а гэта значыць, што высокімі тэмпературамі нікога не здзівіць. Да канца тыдня пры паступленні вельмі цёплага паветра з паўднёвых шырот у нашу краіну прынясе гарачае надвор'е. А пры павышаным фоне атмасфернага ціску верагоднасць ападкаў невялікая, толькі ў суботу ўдзень месцамі па захадзе Брэсцкай вобласці ў няўстойлівым паветры магчымыя кароткачасовыя дажджы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Ужо сёння нам варта чакаць тэмпературнага максімуму тыдня. Ападкаў не будзе ўвогуле, а паветра прагрэецца да плюс 34 градусаў. У суботу, завяршаючы першую дэкаду ліпеня, прагназуецца пераважна без ападкаў, толькі ўдзень месцамі па захадзе Брэсцкай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы. Вецер будзе паўднёвы ўмераны. Тэмпература паветра ў начныя гадзіны складзе плюс 14—20 градусаў, у дзённыя — 28—34 градусаў са знакам плюс.

У нядзелю будзе таксама душна, як і ў суботу, толькі наогул без ападкаў. Вецер чакаецца няўстойлівы слабы да ўмеранага. Тэмпература паветра ўначы — ад плюс 15 цяпла да плюс 20 градусаў, удзень — усё тыя ж 28—34 спякоты.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня гарачае надвор'е захаваецца. У няўстойлівай паветранай масе пры развіцці дажджавой воблачнасці чакаюцца лакальныя навальнічныя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 15—22 градусы. Удзень паветра прагрэецца да 28—34 цяпла.

А вось у аўторак і сераду надвор'е будзе наогул дасягаць амаль афрыканскіх тэмператур. У гэтыя дні месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе ўжо плюс 15—22 (!) градусы, днём будзе 28—34 цяпла, у асобных раёнах да плюс 35 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ТОЛЬКІ Б НЕ ЗАХВАРЭЦЬ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Мне даволі далёка дабірацца ў сваю паліклініку, я абслугоўваюся ў 6-й, — сказала жанчына, — а тут вельмі зручна. Дзеці ў сацсетках прачыталі, што на рынку адкрыты пункт прышчэпак. Вось я і прыйшла. Суседкі ўжо многія прышчапіліся, і былыя калегі па рабоце заклікалі ўзяць з іх прыклад. Падумала, што так спакайней будзе, а то апошнім часам і ў магазін стараюся менш хадзіць, і грамадскім транспартам амаль не карыстаюся.




**Доктар Людміла ЧАСНАКОВА** падрабязна распытвае пацыентку пра самаадчуванне, мерае ціск, тэмпературу, сатурацыю. Упэўніўшыся, што ўсё ў норме, накіроўвае жанчыну да медсястры Вольгі Захарчанкі, якая і праводзіць працэдуру.

Людміла Юр'еўна ў паліклініцы загадвае фізіятэрапеўтычным аддзяленнем. А цяпер, як і многія іншыя калегі, у тым ліку кардыёлагі, рэўматолагі, задзейнічана на рабоце па прафілактыцы і лячэнні ковіду.

— У першыя дні, а працуем мы на рынку з 1 ліпеня, актыўна ішлі супрацоўнікі гандлёвых радоў і павільёнаў, — расказвае Людміла Часнакова. — Хачу сказаць, што ў абсалютнай большасці прышчэпку яны перанеслі добра, былі вельмі рэдкія скаргі на пагаршэнне самаадчування тэрмінам у адны суткі. Потым стан, як правіла, нармалізуецца і чалавек можа спакойна працягваць сваю работу ды звыклы лад жыцця. Тое самае магу сказаць і па вопыце работы з пацыентамі ў паліклініцы. Людзі пераносяць прышчэпку добра, а ў каго назіраюцца павышэнне тэмпературы, млоснасць, ламота, названыя сімптомы праходзяць хутка.

Усе стаміліся ад гэтай хваробы, і спадзяёмся, што вакцынацыя дазволіць сфарміраваць неабходную праслойку людзей, якая засцеражэ ад далейшага распаўсюджвання інфекцыі, працягвае Людміла Юр'еўна. Яна падкрэслівае, што многія людзі вельмі адказна падыходзяць да свайго здароўя. Нават восьсюды прыходзяць не адразу па прышчэпку, а па папярэднюю кансультацыю. Распытваюць, якія ёсць супрацьпаказанні, якія могуць быць наступствы, а потым ужо прымаюць рашэнне. Была адна такая пацыентка: усё падрабязна распытала, а назаўтра прыйшла і зрабіла прышчэпку.

Ахвотна дзеліцца сваімі разважаннямі і ваенны пенсіянер Дзмітрый Адамавіч, які прыйшоў на прышчэпку. Ён сказаў, што доўга думаў, раіўся, пакуль прыняў рашэнне, чытаў розныя меркаванні ў інтэрнэце:

— Шмат чым страшаць там, напрыклад анкалогіяй як наступствам вакцынацыі, а маладых — дык і наогул бясплоднасцю. Думаў, яшчэ пачакаю, пагляджу на іншых. А тут былы таварыш па службе ў Мінску памёр ад наступстваў каранавіруснай інфекцыі. Вось я цвёрда вырашыў ісці ў паліклініку, пра гэты пункт не ведаў. Зайшоў сёння купіць свежай агародніны да абеду, а тут перадаюць па радыё. Вось і падумаў, што зручна, не трэба нават у паліклініку ехаць. Наведванне паліклінікі — гэта ж дадатковая рызыка, а так усё на месцы, амаль што на свежым паветры.

Відавочна, стацыянарныя прышчэпачныя пункты сябе апраўдваюць. Дарэчы, у Брэсце нядаўна адкрыўся яшчэ адзін такі, у гандлёва-забаўляльным цэнтры «Экватар».

Як паведаміў у тэлеграм-канале **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК,** па стане на 1 ліпеня ў абласным цэнтры было прышчэплена 30 397 чалавек.

Заўважу, што насельніцтва Брэста крыху перавышае 340 тысяч. А ў цэлым па вобласці, паводле інфармацыі абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі, грамадскага здароўя, першы кампанент вакцыны атрымала больш за 120 тысяч чалавек (9,3 працэнта насельніцтва). Другі кампанент прышчэпкі атрымала больш за 80 тысяч (6,1 працэнта). Вакцынацыя ў рэгіёне пачалася 19 студзеня. У бягучы момант для прышчэпак выкарыстоўваецца «Гам-Ковід-Вак» («Спадарожнік V» вытворчасці Беларусі).

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

На свае вочы

# «СУСТРАКАЙЦЕ ЛЕТА З АНТЫЦЕЛАМІ»

## Як Масква перажывае новую ўспышку каранавіруса

**У Маскве зноў напружаная сітуацыя з захворваннем на ковід. Індыйскі штам віруса «дэльта» лёгка распаўсюджваецца і ўкладвае на бальнічныя ложкі яшчэ больш пацыентаў... З апошняга тыдня чэрвеня колькасць новых выпадкаў інфіцыравання вагаецца ад 6500 да 8500 у дзень. Мэрыі Масквы прыйшлося пайсці на ўзмацненне супрацьковідных абмежаванняў. Сталічным работадаўцам абавязалі перавесці на аддалены рэжым не менш за 30 % супрацоўнікаў. Пункты грамадскага харчавання могуць наведваць толькі абароненыя ад каранавіруса, што пацвярджаецца спецыяльным QR-кодам. Запаўняльнасць залаў канцэртных, спартыўных, забаўляльных мерапрыемстваў — не больш чым 500 чалавек. Акрамя таго, абавязкова вакцынавацца неабходна 60 % работнікаў сферы паслуг. Ну і, безумоўна, маскі, пальчаткі і санітайзеры зноў павінны стаць паўсюднымі спадарожнікамі масквічоў і прыезджых у грамадскіх месцах. Воляю лёсу ў такі небяспечны перыяд мой шлях на адпачынак ляжаў праз Маскву.**



### Дзве сталіцы — адзін падыход

Палова першага ночы. На мінскі чыгуначны вакзал прыбывае цягнік Калінінград — Масква. Мабыць, дзесьці ў шляху да яго прычапілі дадатковы вагон спецыяльна для пасажыраў з беларускай сталіцы, бо ўсе, хто чакаў цягнік, сталі грузіцца выключна ў гэтую частку рухомага саставу. Праваднiца праверыла ў мяне пашпарт, білет і спыталася пра наяўнасць ПЦР-тэста. Атрымаўшы станоўчы адказ, яна прапусціла мяне ў вагон. Я адказна надзела маску і стала назіраць за супрацьковіднай экіпіроўкай сваіх спадарожнікаў. Практычна ўсе яны ішлі па вагоне без маскі. Ды і ўсю дарогу ніхто асабліва не абцяжарваў сябе гэтым «атрыбутам».

Прыбыўшы на Беларускі вакзал Масквы, я «ўзброілася» ўжо не толькі маскай, але і пальчаткамі. Сябры папярэджвалі: штрафу за адсутнасць гэтых элементаў аховы не пазбегнуць. Зразумела, ніхто па вуліцы ў масцы не хадзіў, але некаторыя служачыя прытрымліваліся правілаў і там. Недалёка ад перонаў размясціўся вакзальны пункт тэсціравання для тых, хто вандруе чыгункай. Там прапаноўвалі два варыянты даследавання: экспрэс (вынік за 3 гадзіны, цана 2750 расійскіх рублёў) і стандарт (адказ на працягу сутак, цана 1800 рублёў). Адзначыўшы значную чаргу, я была рада, што яшчэ ў Мінску атрымала сваю даведку аб адсутнасці захворвання.

Многія мінчане апошнім часам расслабіліся і забыліся аб сродках індывідуальнай аховы (СІА) ад ковіду ў грамадскіх месцах. Таму я разлічвала, што на новай пандэмічнай хвалі ў гэтым плане пакажуць сябе больш адказнымі масквічы. Але мае чаканні не здзейсніліся: неабходнае патрабаванне аб СІА выконваюць і ў Маскве прыкладна двое з пяці чалавек. Складваецца ўражанне, што пра ўспышку каранавіруса ведаюць толькі ўлады і прыезджыя. Я адказна ва ўсіх грамадскіх месцах насіла маску і пальчаткі, перамяшчаючыся на метро, часта апрацоўвала рукі ў стацыянарных санітайзерных устаноўках. Але асабліва паказальны прыклад кітайскай дзяўчыны, якая разам са мной засялялася ў атэль. Яна на рэсепшан прыйшла ўвогуле ў ахоўным касцюме, падобным на тыя, што носяць медыкі ў «чырвоных» зонах.

Нагадваюць аб СІА ў Маскве ўсюды: аб'явы на ўваходных дзвярах вакзалаў, станцый метрапалітэна, аўтобусаў, на вокнах грамадскага транспарту, гучнагаварыцелі. Крэслы ў транспарце праз адно пазначаныя: «Трымайце дыстанцыю, не садзіцеся тут».

Усе кафэ і рэстараны пускаюць у памяшканне з 28 чэрвеня толькі ўладальнікаў QR-кодаў, якія выдаюць тым, хто зрабіў прышчэпку, перахварэў COVID-19 на працягу апошніх шасці месяцаў, у каго ёсць адмоўны ПЦР-тэст, сапраўдны на працягу трох дзён. Кафэ на вуліцы і з летнімі верандамі да 12 ліпеня можна наведваць усім без QR-кода. Пакуль жыхары сталіцы шукаюць магчымасці атрымаць коды, маленькія кавярні і бістро знайшлі выхад, як захаваць наведвальнікаў. Стойкі з кавааўтаматамі і касы для заказу на вынас яны ўстанаўліваюць каля ўвахода, такім чынам не парушаючы забароны і не абцяжарваючы гасцей праверкамі кодаў.

### Прышчапіцеся на здароўе

Асаблівыя сілы ўлад кінутыя на прапаганду вакцынацыі. Білборды і рэклама ў горадзе мільгаюць слоганамі тыпу «Сустракайце лета з антыцеламі», «Каранавірус забівае кожны дзень. Зрабіце прышчэпку сёння», «Хварэць — балюча. Паміраць — страшна. Зрабіць прышчэпку — проста». Сярод тых, хто атрымаў прышчэпкі, разыгрываюць каштоўныя прызы — аўто, а ў некаторых рэгіёнах нават кватэры.

У Маскве я сустрэлася са сваёй сяброўкай, якая працуе ў забаўляльнай сферы. Спыталася, як яна ставіцца да вакцынацыі і ці паспела зрабіць прышчэпку? Вакцынацыю яна прайшла на днях. Доўга вагалася, але ўсвядоміла, што забаўляльная сфера пацярпела ад ковіду больш за іншыя і нават цяпер не можа на поўную магутнасць аднавіць сваю дзейнасць. Прышчэпка — адна з магчымасцяў для артыстаў выходзіць на сцэну нават у пандэмію.

«Таму прадстаўнікі нашай сферы павінны вакцынавацца ў першую чаргу, каб мы маглі перамяшчацца па краіне, выязджаць у іншыя дзяржавы з гастролямі. Яшчэ адзін плюс прышчэпкі — прывілеі для вакцынаваных пры перасячэнні меж», — сцвярджае дзяўчына.

Па яе словах, артысты, у адрозненне ад працаўнікоў сферы паслуг, не блізка кантактуюць з людзьмі, але, тым не менш, выступаюць перад вялікай колькасцю гледачоў і адчуваюць сваю адказнасць за здароўе наведвальнікаў, калег па сцэне.

«Артысты вельмі сумуюць па гледачах, таму хочуць, каб і яны прышчапіліся, бо на многія канцэртныя пляцоўкі наведвальнікаў не пускаюць без QR-кодаў», — кажа артыстка.

Але многія расіяне не спяшаюцца вакцынавацца. Хоць Масква і Маскоўская вобласць выходзяць у лідары па колькасці вакцынаваных. Штодзённы запіс у канцы чэрвеня ў сталіцы на прышчэпку дасягаў 87 тысяч чалавек. Як сцвярджаюць эксперты, для дасягнення калектыўнага імунітэту неабходна прышчапіць 60—70 % дарослага насельніцтва Расіі.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*г. Масква.*



На кантролі

# РЫЧАГІ ДЛЯ ДАЎГАБУДАЎ

## Раёны, якія дапусцяць рост колькасці звышнарматыўных будаўнічых аб'ектаў, рызыкуюць застацца без новых інвестпраектаў

**Такую ўстаноўку робяць улады Гродзенскай вобласці, каб хутчэй вырашыць праблему даўгабудаў. На пачатак года тут налічвалася звыш 340 такіх аб'ектаў. Іх мае кожны раён. Гэта будынкі школ, клубаў, сельскагаспадарчых пабудоў. Ёсць нават музей тэхнікі і царква. Абласныя ўлады сумесна з Камітэтам дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці разгледзелі варыянты іх далейшага лёсу.**



### Даць другі шанц

Нядаўна, падчас камандзіроўкі ў гарадскі пасёлак Радунь Воранаўскага раёна, звярнула ўвагу на будынак: спецыяльная агароджа і адноўленая частка сведчылі аб тым, што тут павінны весціся будаўнічыя работы. У Воранаўскім райвыканкаме пацвердзілі, што былая школа рэканструюецца ў цэнтр нацыянальных культур. Таксама тут плануецца размясціць сельвыканкам, кафэ, музейныя экспазіцыі, кінатэатр, залу для дыскатэк. Задума вельмі добрая, бо Радунь мае патрэбу ў культурных установах. Але праект ператварыўся ў даўгабуд.

Некалькі гадоў таму яго ўзяліся ажыццявіць ізраільскія інвестары ў абмен на перадачу ім былой сінагогі. Планы ў інвестараў былі вялікія, ажно да будаўніцтва гасцініцы для турыстаў. У Радуні жыў і пахаваны сусветна вядомы равін і філосаф Хафец Хаім, які заснаваў тут знакамітую школу — іешыву. Дарэчы, і гэты будынак цяпер таксама пустуе, бо інвестары з'ехалі.

У рэканструкцыю цэнтра нацыянальных культур ужо ўкладзена 1,5 мільёна рублёў. Для таго каб завяршыць работы, патрэбна яшчэ столькі ж. Сёлета з бюджэту плануецца накіраваць 300 тысяч рублёў. А ў будучым — уключыць праект у абласную інвестпраграму. Гэта магчыма зрабіць з тымі аб'ектамі, дзе зроблена большая частка работ. Тады даўгабуды атрымліваюць права на другое жыццё.

Напрыклад, у Беравставіцы мяркуюць прадаць гасцініцу, якая знаходзіцца ў стадыі капітальнага рамонту. У Свіслачы — завяршыць рамонт храма, работы вяліся з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў. Магчыма, да фінансавання падключыцца і гродзенская епархія.

Ёсць намер давесці да завяршэння работы на мемарыяльным комплексе ў Смаргоні. У райвыканкаме падлічылі, што для гэтага неабходна яшчэ пяць мільёнаў рублёў — на ўкладку граніту. Комплекс узводзіўся за кошт саюзнага бюджэту да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны, але сродкаў не хапіла. Магчыма, праект будзе перагледжаны ў бок зніжэння кошту.

Адзін з праблемных аб'ектаў у Гродне — заапарк. Тут прайшла маштабная рэканструкцыя, але поўнасцю аб'ект не здадзены. Не дароблены сланоўнік, ён зарастае пустазеллем, не ўведзены ў эксплуатацыю будынак акварыума. Такая сітуацыя цягнецца цэлае дзесяцігоддзе. Мяркуецца, што рэканструкцыя завершыцца да канца пяцігодкі.

### Радыкальныя меры

Многія даўгабуды страцілі эканамічную вартасць, псуюць выгляд населеных пунктаў, займаюць зямельныя ўчасткі. У КДК лічаць, што ў такіх выпадках іх трэба знасіць. У гэты лік трапілі цэх па разліве мінеральнай вады і сярэдняя школа ў Беравставіцкім раёне. Аб'екты пачалі будаваць у 1990-х гадах і хутка спыніліся, цяпер у іх няма патрэбы. Недабудаваныя дамы культуры маюць намер знесці ў Воранаўскім, Зэльвенскім, Мастоўскім раёнах. Пад знос ідзе і цяплічны камбінат недалёка ад Гродна. Яго ўжо замянілі эфектыўнымі, новымі цяпліцамі, менш энергазатратнымі.

У Гродзенскім раёне адбудзецца дэмантаж пастаментаў для музея тэхнікі. Планавалася, што першы такі музей з'явіцца на 22 гектарах поля на шляху да Аўгустоўскага канала. У яго рэалізацыю ўкладзена 108 тысяч долараў бюджэтных сродкаў. Але праект ужо некалькі гадоў замарожаны.

У Навагрудку запланаваны знос гандлёвага цэнтра са сталовай, а таксама лікёра-гарэлачнага завода. У Смаргоні — аўтаматычнай тэлефоннай станцыі. Тут будзе ўзводзіцца жылы мікрараён. Увогуле, аб'ектаў пад знос не адзін дзясятак. Марудная работа па іх ліквідацыі звязаная са значнымі затратамі — ад 500 тысяч да аднаго мільёна рублёў. Магчыма, частка аб'ектаў увойдзе ў план вучэнняў МНС.

### Раскласці па паліцах

У камітэце архітэктуры і будаўніцтва Гродзенскага аблвыканкама зрабілі аналіз незавершаных аб'ектаў і вызначылі кірункі работы з імі. Аказалася, што найбольшая іх колькасць адносіцца да сферы сельскай гаспадаркі і харчавання — 44 %. Астатнія належаць прадпрыемствам ЖКГ, упраўленням капітальнага будаўніцтва, адукацыі, культуры, аховы здароўя і іншым сферам. На думку старшыні камітэта Міхаіла Петуха, ёсць магчымасць у хуткім часе скарацыць колькасць даўгабудаў на 20 %. Гэта збольшага сельскагаспадарчыя будынкі, якія даўно эксплуатуюцца, але не прайшлі прыёмку. Яны сёння ўцягваюцца ў абарот і здымаюцца з уліку. Каб разабрацца з іншымі, патрэбен час. Па-першае, каб размеркаваць іх па ступені запатрабаванасці. Тыя, што не маюць ніякай перспектывы, — спісаць і знесці. Заканадаўства гэта дазваляе. А тыя, што маюць гатоўнасць звыш 10 %, завяршыць і здаць у эксплуатацыю. Дарэчы, на дадзеную катэгорыю прыходзіцца амаль палова ўсіх даўгабудаў — каля 200. Звыш 100 аб'ектаў прапануецца перапрафіляваць і прадаць.

Перад раёнамі пастаўлены канкрэтныя задачы — да 1 верасня завяршыць сістэматызацыю даўгабудаў і не дапускаць іх росту. Там, дзе сітуацыя пагоршыцца, ёсць рызыка застацца без фінансавання новых праектаў на будучы год. А тыя раёны, якія спраўляюцца са згаданай праблемай, змогуць разлічваць на дадатковыя аб'екты ў абласной інвестпраграме, падкрэслілі ў аблвыканкаме.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

### Каментарый КДК

**Таццяна СЛАБЫШ, начальнік упраўлення КДК Гродзенскай вобласці:**

— На пачатак года ў рэгіёне налічвалася 340 аб'ектаў незавершанага будаўніцтва. Гэта аб'екты дзяржаўных прадпрыемстваў альбо прыватныя, дзе будаўніцтва вялося з выкарыстаннем бюджэтных сродкаў.

КДК ініцыіраваў татальную інвентарызацыю па ўсіх раёнах, каб выявіць рэальную карціну незавершанага будаўніцтва. Значныя сродкі ўкладзены ў праектаванне, а будаўніцтва нават не пачыналася. Станоўчы момант — за першы квартал 2021 года колькасць даўгабудаў зменшылася амаль на палову сотні, пры гэтым зафіксавалі 20 новых.

У КДК работа праводзілася з кожным уласнікам, разбіраліся па кожным аб'екце. Чакалася, што толькі за чэрвень вырашыцца пытанне па 60 аб'ектах. На жаль, работа вядзецца вельмі павольна. Многія (амаль па чвэрці аб'ектаў) схільныя адкладваць вырашэнне пытання на далёкую перспектыву — да канца пяцігодкі. Справа магла б рухацца хутчэй, калі б раёны валодалі поўнай інфармацыяй па сваіх даўгабудах.

# АДХОДЫ Ў ДАХОДЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Новы рэгіянальны палігон пабудуюць у пасёлку Дружны для патрэб Пухавіцкага і Чэрвеньскага раёнаў. Чатыры аб'екты па захаванні ЦКА, якія дзейнічаюць на сённяшні дзень у згаданых рэгіёнах, будуць закрытыя і рэкультываваныя. Яны былі ўзведзены ў 80-90-х гадах мінулага стагоддзя. І, вядома, не адпавядаюць сучасным патрабаванням: з кожным годам колькасць адходаў павялічваецца, пляцоўкі перагружаныя. Акрамя таго, там не прадугледжаны ахоўныя сродкі, якія зніжаюць нанясенне шкоды навакольнаму асяроддзю.

— Мэта праекта — максімальнае выкарыстанне і прыцягненне ў абарот цвёрдых камунальных адходаў, мінімізацыя іх пахавання. Гэта цалкам адпавядае патрабаванням Нацыянальнай стратэгіі па абыходжанні з цвёрдымі камунальнымі адходамі і другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі ў Рэспубліцы Беларусь да 2035 года, — лічыць Кацярына Салаўёва.

Аб'ект праектуецца як комплекс розных пляцовак. Тут прадугледжаны як сам палігон цвёрдых бытавых адходаў, так і лінія іх сарціроўкі. З'явіцца і пляцоўка для кампаставання. Такім чынам, адходы будуць перапрацоўвацца цалкам і выкарыстоўвацца паўторна. Пад пахаванне пойдзе толькі тое, што немагчыма перапрацаваць. Будзе таксама ўладкаваны ўчастак для перапрацоўкі будаўнічых адходаў.

На аб'екце створаць належныя ўмовы для работы абслугоўваючага персаналу. Да яго паслуг узвядуць адміністрацыйны будынак з офісамі, памяшканнем для вядзення перагавораў, санвузлом і пакоем для прыняцця ежы.

Ужо прайшлі міжнародныя таргі па выбары падрадчыка для будаўніцтва палігона. Размова вядзецца з патэнцыяльным перамożцам, які прапанаваў найлепшыя ўмовы. Прапрацоўваецца пытанне аб яшчэ большым зніжэнні цаны. У хуткім часе павінны заключыць дагавор. З улікам праектавання тэрмін будаўніцтва аб'екта — паўтара года. Усё ідзе па запланаваным графіку. У 2022 годзе мяркуецца ўвесці яго ў дзеянне.

Палігон размесціцца побач з дзеючай звалкай каля ЦЭЦ-5 і прамысловых прадпрыемстваў. Найбліжэйшая вёска Нізоўка знаходзіцца на адлегласці ў два кіламетры.

Размовы аб будаўніцтве палігона ў Пухавіцкім раёне ішлі даўно. Але ажыццявіць задуму змаглі дзякуючы падпісанню Ўказа Прэзідэнта Беларусі аб узвядзенні пляцоўкі і прыцягненні пазыкі.

Для рэалізацыі праекта створана новая юрыдычная асоба — камунальнае унітарнае нарыхтоўчае прадпрыемства «ЭкаДругЗаб», якое размясцілася ў пасёлку Дружны.

У рэгіёне плануецца таксама закупка неабходнай тэхнікі і кантэйнераў для змешанага і раздзельнага збору адходаў. У 2019 годзе за кошт сродкаў Аператара другасных матэрыяльных рэсурсаў набыта 3638 кантэйнераў ёмістасцю 120 літраў, якія аддалі домаўладальнікам, што пражываюць у Мар'інай Горцы ў раёне індывідуальнай жылой забудовы. Распрацавана таксама рэгіянальная схема абыходжання з адходамі для Пухавіцкай зоны абслугоўвання. Схема ўхвалена навукова-тэхнічным саветам Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Дарэчы, палігон — гэта пілотны праект не толькі для Міншчыны, але і наогул для Беларусі. Дакладныя і строгія стандарты, найноўшая сістэма збору адходаў, якія будуць выкарыстаны тут, дазволяць знізіць шкоднае ўздзеянне на навакольнае асяроддзе. Да 2030 года ў Беларусі мяркуецца пабудаваць 30 аб'ектаў такога тыпу.

А як ставяцца да новага палігона самі жыхары Пухавіцкага раёна, пацікавілася ў сустрэчных.

— Я, вядома, ухваляю ідэю. Думаю, што ў Беларусі павінна быць разгалінаваная сетка такіх палігонаў. Гэта дазволіць захаваць экалогію, здабываць больш другасных матэрыяльных рэсурсаў. Але ў нашых людзей яшчэ вельмі нізкая культура ў плане правільнага збору адходаў, — падзялілася развагамі Анастасія. — У нашым двары стаяць кантэйнеры — асобна для паперы, шкла. Ды жыхары кідаюць туды што заўгодна без разбору. З гэтай нагоды раскажу павучальную гісторыю. У студэнцкія гады падчас летніх канікул мне давялося папрацаваць у адной з еўрапейскіх краін. Мы з сяброўкай здымалі невялікі пакой у гаспадыні. Аднойчы смецце, якое сабралася за тыдзень, а гэта поліэтыленавыя ўпакоўкі, папера, бульбяныя ачысткі, ссыпалі разам і збіраліся выкінуць. Але нашы намеры раскусіла Эліза і прымусіла раскласці кожны від адходаў у асобныя пакеты.



— Сітуацыя са зборам смецця, адходаў у апошнія гады змянілася да лепшага, — лічыць Аляксей. — Ва ўсякім разе, я не бачу тых смярдзючых звалак, што былі раней. Прычым вецер разганяў з іх на дарогу, поле што заўгодна — шматкі паперы, поліэтыленавыя пакеты, упакоўку. А пасярод смецця корпаліся збіральнікі кардону, шкляных бутэлек і іншага. Такія звалкі наогул павінны знікнуць. А на іх месцы трэба, каб з'явіліся цывілізаваныя комплексы з сартавальнымі лініямі, перапрацоўчымі вытворчасцямі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**
*Пухавіцкі раён.*

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Унитарное предприятие «СлавМол», Гомельская обл., Гомельский р-н, Азделинский с/с, аг. Азделино, ул. Новая, д. 3** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов**<br>**Адрес – Гомельская обл., Гомельский р-н, Тереничский с/с, 5,**<br>**ПЛОЩАДКА ДЛЯ СЕЛЬСКОХОЗЯЙСТВЕННЫХ МАШИН, вблизи п. Калиновка** | |
| **Площадка для сельскохозяйственных машин** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. номер 310/С-68474, общая площадь 20032,4 кв. м.<br>***Сведения о земельном участке***: предоставлен продавцу пл. **6,7076 га** на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания стоянки сельскохозяйственных машин**.** Ограничения (обременения) – охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0249 га), расположен на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранной зоне реки, водоема) – пл. 2,8087 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 310 375,98 бел. руб.** (снижена на 20 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |
| **Условия оплаты предмета электронных торгов** | |
| По письменному заявлению Покупателя (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) может быть предоставлена рассрочка оплаты с ежемесячной индексацией платежей, исходя из индексов цен производителей промыш. продукции производственно-технич. назначения, но не более 12 месяцев. Право собственности на объект переходит Покупателю после полной оплаты его стоимости | |
| **Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by** | |
| Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов | |
| Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звезда» от 08.05.2021 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона | |
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 22.07.2021 в 11.00.**<br>**Окончание торгов: 22.07.2021 в 12.00.**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 20.07.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности г. Минска и принадлежащего УП «Завод эффективных промышленных конструкций» (Продавец) на праве хозяйственного ведения**

**Лот № 1**: квартира, инв. № 500/D-798822044, 32,9 кв. м. Цена – 102000,00 руб.
**Лот № 2**: квартира, инв. № 500/D-798822051, 58,1 кв. м. Цена – 155000,00 руб.
**Лот № 3**: квартира, инв. № 500/D-798822052, 32,5 кв. м. Цена – 100000,00 руб.
**Лот № 4**: квартира, инв. № 500/D-798822053, 32,7 кв. м. Цена – 101000,00 руб.
**Лот № 5**: квартира, инв. № 500/D-798822066, 32,5 кв. м. Цена – 100000,00 руб.
**Лот № 6**: квартира, инв. № 500/D-798822069, 58,1 кв. м. Цена – 155000,00 руб.
**Лот № 7**: квартира, инв. № 500/D-798822070, 32,6 кв. м. Цена – 101000,00 руб.
**Лот № 8**: квартира, инв. № 500/D-798822071, 32,4 кв. м. Цена – 100000,00 руб.

Цена по Лотам №№ 1–8 является начальной ценой без учета НДС.

**Адрес Лотов: г. Минск, ул. Лобанка, д. 64, кв. 88, 95, 96, 97, 110, 113, 114, 115.**

**Аукцион состоится 11.08.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь **gki.gov.by,** Минского городского исполнительного комитета **minsk.gov.by,** Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182


# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 1.1 по генплану. 1-я очередь строительства»

**Информация о застройщике:**

**Открытое акционерное общество «БелАТЭП» (ОАО «БелАТЭП»).**

**Место нахождения:** 220033, г. Минск, ул. Стрелковая, д. 14. Режим работы: понедельник – пятница – с 9.00 до 17.00, обеденный перерыв – с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация застройщика:** Открытое акционерное общество «БелАТЭП», зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 10 июля 2000 года, № 100104554.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ОАО «БелАТЭП» участие не принимало.

**Информация об объекте строительства:**

**Цель строительства:** Строительство объекта недвижимости «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 1.1 по генплану. 1-я очередь строительства.

**Этапы и сроки реализации строительства:** начало строительства – 04 мая 2020 года, завершение строительства – 18.08.2021 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 788-15/19 от 14 января 2020 года, выдано Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома: **г. Минск, пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко.**

**Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома:**

19-этажный 126-квартирный жилой дом в конструкциях серии М 111-90 со встроенными помещениями административного назначения на 1-м этаже. Наружные стены – из сборных трехслойных железобетонных панелей толщиной 300 мм с эффективным утеплителем. Внутренние стены предусмотрены из железобетонных панелей толщиной 160 мм. Высота помещений жилого дома (от пола до потолка) – 2,64 м. Проектом предусмотрены техподполье, теплый технический чердак. Жилой дом оборудован пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 1000 кг. Все квартиры имеют остекленные лоджии. Окна и элементы остекления лоджий – из профилей ПВХ. Проектом предусмотрена звукоизоляция в виде упругих прокладок между шахтами лифтов и конструкциями здания. Для физически ослабленных лиц предусмотрены подъемники при входах в здание. Система отопления запроектирована двухтрубная горизонтальная поквартирная с установкой узла учета тепла для каждой квартиры. В проекте предусматривается индивидуальный учет холодной и горячей воды для каждой квартиры. Предусмотрен расчетный учет электроэнергии: для каждой квартиры – в этажных щитках. Все приборы объединены в систему автоматизированного учета (АСКУЭ).

Наружная отделка: стены – фактурное покрытие защитно-декоративным полимерным составом (ЗДПС), окраска фасадной краской. Источник теплоснабжения – наружные тепловые сети. Для телефонизации жилого дома проектом предусмотрен ввод магистрального волоконно-оптического кабеля. Проектом предусмотрено охранно-переговорное устройство, предназначенное для ограничения доступа посторонних лиц в подъезды жилого дома и организации двухсторонней связи между абонентом и посетителем.

Общее количество квартир – 126, в том числе однокомнатных квартир – 18, двухкомнатных квартир – 54, трехкомнатных квартир – 54. Общее количество встроенных помещений административного назначения – 7.

Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства: **двухкомнатных – 6 единиц, трехкомнатных – 10 единиц.**

**Цены на объекты долевого строительства:**

двухкомнатные квартиры общей площадью от 44,23 м$^2$ до 44,41 м. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет 1300 (тысяча триста) долларов США;

двухкомнатные квартиры общей площадью от 63,92 м$^2$ до 64,17 м. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет 1200 (тысяча двести) долларов США;

трехкомнатные квартиры общей площадью от 63,44 м$^2$ до 63,71 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры составляет 1230 (тысяча двести тридцать) долларов США;

трехкомнатные квартиры общей площадью от 77,35 м$^2$ до 77,6 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ общей площади квартиры составляет 1130 (тысяча сто тридцать) долларов США.

Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к соответствующей иностранной валюте, установленному Национальным банком Республики Беларусь на день платежа.

На предприятии действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения.

**Условия оплаты:** уплата цены объекта долевого строительства (цены договора) производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. По соглашению сторон уплата цены объекта долевого строительства может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 27 февраля 2020 года № 578 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешении строительства».

**Границы земельного участка:** г. Минск, район пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко.

**Площадь земельного участка:** 1,2442 га, назначение – для строительства объекта «Группа многоквартирных жилых домов».

**Элементы благоустройства:** проектом предусмотрены полное благоустройство территории с организацией подъезда, тротуара для пешеходов, пешеходных дорожек по основным направлениям движения пешеходов. На прилегающей территории запроектированы: площадка для сбора бытовых отходов, детская игровая площадка, места для парковки автомобилей.

**Функциональное назначение нежилых помещений в жилом доме, не входящих в состав общего имущества:** 7 (семь) встроенных помещений административного назначения с отдельными входами на первом этаже.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:**

Помещения инженерного назначения, межквартирные, лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома. Конкретный перечень имущества, входящего в состав общего имущества совместного домовладения, определяется застройщиком по итогам технической инвентаризации и передается застройщиком по акту приемо-передачи представителю товарищества собственников, либо лицу, уполномоченному общим собранием дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию: **18 августа 2021 года.**

**Договор строительного подряда:** договор строительного подряда № 22/04-20 от 22 апреля 2020 года заключен Застройщиком с ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе продаж застройщика, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Стрелковой, д. 14, к. 21.

Тел.: 8 (029) 105 7171, 8 (029) 106 7171) или на сайте **antonovsky.by**

## ОАО «Небанковская кредитно-финансовая организация «ЕРИП»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2021 | 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | - | - |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 1 784 | 1 921 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 29 421 | 24 154 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 1 011 | 1 650 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | - | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 709 | 709 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 9 678 | 10 532 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | - | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 1 | 49 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 971 | 2 452 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 44 575 | 41 467 |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | - | - |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 1 501 | 1 243 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | - | - |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 1 505 | 1 513 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 3 006 | 2 756 |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 28 548 | 24 588 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 310 | 979 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | - | - |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 11 711 | 13 144 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 41 569 | 38 711 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 44 575 | 41 467 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2021 | 01.07.2020 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 2 339 | 1 230 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | - | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 339 | 1 230 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 12 246 | 10 555 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 3 | 2 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 12 243 | 10 553 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 8 | 88 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | - | - |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | - |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 447 | 30 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 664 | 523 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 8 637 | 7 811 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 198 | 178 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 5 972 | 4 375 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 1 608 | 1 046 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 4 364 | 3 329 |

Председатель Правления С.С. Бенедис

Главный бухгалтер Н.И. Базылевич

Дата подписания: 8 июля 2021 г.


УНН 190431606

**УП «Белконфискат»**
**объявляет о проведении электронных торгов 28.07.2021 г. по продаже имущества Сапего М.Э.**
**автомобиль «Мазда 626», 1998 г. в.,**
**начальной стоимостью 1 200 рублей.**
На сайте **belkonfiskat.by** размещена информация о торгах.
Справки по тел. **8 (017) 3639489.**

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

9 ліпеня 2021 г. № 26 (611)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ФОРМЫ РАБОТЫ









# ДЗЕНЬ СЕЛЬСАВЕТА — ЯКІ ЁН?

**Рашэнне сацыяльных, эканамічных і культурных праблем мясцовага значэння для павышэння ўзроўню і якасці жыцця — галоўная мэта дзейнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання. У сваю чаргу, старшыні сельвыканкамаў, кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў на вёсцы, актывісты грамадскіх арганізацый, дэпутаты і, вядома, самі людзі — звёны аднаго ланцуга, ад надзейнасці якога і залежыць паспяховае вырашэнне надзённых праблем. Як на практыцы дзейнічае падобная схема ўзаемадзеяння і наколькі яна эфектыўная — гэтыя і іншыя пытанні разглядаюць падчас традыцыйных дзён сельсавета. Добрая практыка склалася на Лоеўшчыне.**

Чарговы раз з гэтай нагоды завіталі ў Каўпенскі сельсавет. Убачыць на свае вочы, якая работа праводзіцца на тэрыторыі, прааналізаваць зробленае і расставіць акцэнты на будучыню сюды прыехалі **старшыня Лоеўскага раённага выканаўчага камітэта Веранiка БАЙКОВА** і **кіраўнік дэпутацкага корпуса раёна Ірына ПАСТУХОВА.**

— Дні сельсавета трывала ўвайшлі ў практыку работы мясцовай улады, паколькі яны дазваляюць разглядзець усе аспекты дзейнасці ўстаноў і арганізацый па жыццезабеспячэнні мясцовага насельніцтва, навядзенні парадку на зямлі, выявіць недахопы і вызначыць шляхі іх рашэння, — зазначае Ірына Мікалаеўна.

Тэрыторыя сельсавета — гэта цэнтральны населены пункт, аграгарадок Каўпень, вёскі Мохаў, Казярогі, Пустая Града, Крупейкі, Шчыцы. У цэлым тут сёння пражывае звыш 1150 чалавек, 649 вяскоўцаў — людзі працаздольнага ўзросту, 182 — дзеці да 18 гадоў. Падчас аб'езду вёсак раённыя ўлады звярнулі ўвагу на добраўпарадкаванасць населеных пунктаў.

— Вырашаць адказную задачу па навядзенні парадку на зямлі дапамагаюць замацаваныя арганізацыі раёна, а таксама неабыякавыя да лёсу малой радзімы вяскоўцы, — дзеліцца **старшыня Каўпенскага сельвыканкама Людміла ПРЫМАК.** Людміла Уладзіміраўна адзначыла: сёлета частка бюджэтных сродкаў выдаткавана на афарбоўку агароджаў у аграгарадку Каўпень і вёсцы Крупейкі, на абрэзку аварыйных дрэў. Добраахвотныя ахвяраванні мясцовых жыхароў пойдуць на закупку фарбы для абнаўлення малых архітэктурных формаў, помнікаў, на набыццё будаўнічага інвентару. Цяпер дэманціруецца трухлявая загарадзь, устанаўліваецца новая агароджа, фарбуецца.

Увогуле, Каўпенскі сельсавет — прыклад удалай работы па заахвочванні вяскоўцаў да добраўпарадкавання родных мясцін. Людзі тут вельмі актыўныя. Летась жыхары вёскі Крупейкі выступілі з ініцыятывай за ўласныя сродкі добраўпарадкаваць мясцовую зону адпачынку — возера Застава. Ачысціць, прыбраць ад дзікай расліннасці вадаём па заяўцы людзей узялося камунальнае меліярацыйнае ўнітарнае прадпрыемства «Лоеўскае ПМС».

*(Заканчэнне на 17-й стар.)*

ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

## На карысць усяго рэгіёна

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА прыняла ўдзел у цырымоніі перадачы базы адпачынку жаночаму манастыру.**

Спікер верхняй палаты парламента днямі прымала ўдзел ва ўрачыстай цырымоніі перадачы ў бязвыплатнае карыстанне базы адпачынку «Суя» адкрытага акцыянернага таварыства «Гомельтранснафта Дружба» Спаса-Ефрасіннеўскаму стаўрапігіяльнаму жаночаму манастыру ў Полацку.

У мерапрыемстве ўдзельнічалі таксама генеральны дырэктар ААТ «Гомельтранснафта Дружба» Алег Барысенка і ігумення манастыра Еўдакія, паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты парламента.



Фота БелТА.

Трэба сказаць, што раней база адпачынку належала філіялу ААТ «Гомельтранснафта Дружба», размешчанага ў Наваполацку. Але сёння яна не запатрабаваная, таму манастыр папрасіў у кіраўніцтва прадпрыемства перадаць ім гэты аб'ект.

— Манастыр у Полацку вялікі, ён пашыраецца. Тут самая вялікая колькасць сясцёр — іх больш за сто. Важна, што тут не толькі моляцца Богу, але і праводзіцца духоўна-асветніцкая работа, сюды прыходзіць моладзь, дзеці. База адпачынку будзе яшчэ адным цэнтрам для духоўна-маральнага выхавання маладога пакалення, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Старшыня Савета Рэспублікі пераканана, што перадача базы адпачынку апраўданая: паміж дзяржаўнымі ўстановамі і праваслаўнай царквой наладжана сур'ёзнае ўзаемадзеянне ў рабоце з моладдзю.

— Полацк — гэта гісторыя, нашы карані, адкуль пачыналася асвета. Цяпер праводзіцца рэканструкцыя Спаса-Праабражэнскага храма. База адпачынку будзе не толькі на карысць сясцёр і манастыра, але і ўсяго рэгіёна, — адзначыла на заканчэнне спікер Савета Рэспублікі.

## Аздараўленне і валанцёрства

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала СМАЛЯК правяла прамую лінію для жыхароў Гомельскага раёна.**

Заяўніцу з Хойніцкага раёна цікавілі пытанні аздараўлення школьнікаў, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання. Ала Смаляк патлумачыла, што забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем і аздараўленнем дзяцей, якія пражываюць або навучаюцца на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях, з'яўляецца прыярытэтнай тэмай. Рэспубліканскім цэнтрам па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва штогод набываюцца для такой катэгорыі дзяцей пуцёўкі ў санаторна-курортныя і аздараўленчыя арганізацыі Беларусі.

Жыхар Лоеўскага раёна задаў пытанне аб тым, як стаць валанцёрам Чырвонага Крыжа, дзе можна прайсці навучанне па аказанні першай дапамогі. Ён атрымаў вычарпальны адказ.

— Важным элементам прамых ліній з'яўляецца тлумачальная работа, павышэнне інфармаванасці грамадзян па розных тэмах. І жыхары Гомельскай вобласці ўсё больш актыўна карыстаюцца гэтай магчымасцю, каб атрымаць адказы на пытанні, якія цікавяць, — падкрэсліла сенатар.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# Кожны зварот — на кантролі

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна РУНЕЦ правяла прыём грамадзян.**

— Калі ацэньваць увесь тэматычны спектр праблем грамадзян, з якімі звяртаюцца ў Савет Рэспублікі, ён разнастайны, — акцэнтавала ў размове з журналістамі сенатар і дадала, што людзі сталі больш актыўнымі, іх цікавяць не толькі ўласныя бытавыя праблемы, але і змены ў заканадаўстве, эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.

Што датычыцца тэматыкі зваротаў у Пастаянную камісію Савета Рэспублікі, то прэваліруе эканамічны блок пытанняў. Па ацэнках спецыялістаў, якія там працуюць, эканамічную сферу ахопліваюць больш як 50 % усіх праблем, з якімі людзі сюды звяртаюцца. Гаворка і аб умовах атрымання банкаўскіх крэдытаў, выканання дамоў з лізінгавымі арганізацыямі, аказання страхавых паслуг.



— Часта грамадзяне звяртаюцца ў мікрафінансавыя арганізацыі, бяруць крэдыты і не чытаюць дагавор, а потым звяртаюцца з просьбай аб дапамозе ў вырашэнні праблемы, — патлумачыла сенатар. — Вядома, фінансавую адукаванасць грамадзян неабходна павышаць.

Акрамя таго, па дапамогу ў Пастаянную камісію звяртаюцца тыя, хто не знайшоў паразумення ў сферы гандлю: пераважна звароты датычацца абароны правоў спажыўцоў.

— Напрыклад, набываючы тавар у краме, калі ён аказваецца няякасным, пакупнік не можа яго замяніць. Такія праблемы таксама існуюць, — расказала Таццяна Рунец.

Безумоўна, ёсць і традыцыйныя звароты без прывязкі да спецыфікі камісіі, і датычацца яны праблем ЖКГ. Так, напрыклад, на прыём да сенатара звярнулася мінчанка, якая незадаволена правядзеннем капітальнага рамонту жылога дома па вуліцы Варанянскага. Яна звярнула ўвагу на шматлікія хібы будаўнікоў падчас правядзення рамонту. Трэба дадаць, што яна вырашыла выказаць не толькі сваю асабістую пазіцыю, але і іншых суседзяў, якія пакутуюць ад пастаянных праблем, што з'явіліся ў выніку гэтага рамонту. Жанчына ж, каб адстаяць сваю пазіцыю, гатова ісці нават у суд.

— Мы выедзем на наступным тыдні па вашым адрасе разам з прадстаўнікамі адміністрацыі раёна і камунальнікамі, каб дакладна высветліць усе абставіны і разабрацца на месцы, — паабяцала заяўніцы Таццяна Рунец. — І на кантролі яго вырашэнне мы будзем трымаць, можаце не сумнявацца.

У гутарцы з журналістамі сенатар адзначыла, што кожны зварот Пастаяннай камісіяй разглядаецца вельмі ўважліва:

— Мы імкнёмся дапамагчы кожнаму ці хоць бы разабрацца ў тым, наколькі сур'ёзная праблема, — падкрэсліла яна.

Таксама яна звярнула ўвагу на актыўнасць грамадзян у рабоце над законапраектамі. Напрыклад, на прыём да сенатара прыйшоў грамадзянін, які пажадаў выказаць свае заўвагі і прапановы па законапраекце «Аб самарэгуляваных арганізацыях».

Нагадаем, што гэта новы законапраект для нашай краіны, вопыт існуе толькі ў Расіі і Казахстане. У першым чытанні ён прыняты Палатай прадстаўнікоў, але, тым не менш, парламентарыямі выказваліся заўвагі аб дапрацоўцы гэтага законапраекта.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**фота аўтара.**

ЭКАНОМІКА

**Таццяна РУНЕЦ:**

# «Форум рэгіёнаў — эфектыўная пляцоўка для ўмацавання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва»

**Такую думку выказала старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец у гутарцы з журналістам «МС». Акрамя таго, кіраўнік профільнай камісіі расказала, чаго чакае ад Беларуска-расійскага дзелавога савета, створанага гандлёва-прамысловымі палатамі, наколькі вырас тавараабарот з пачатку года і як змяніўся кантрактны партфель за гады правядзення форуму.**



## Ад кармоў для жывёлы да касмічных праграм

Адшумеў, адгрымеў чарговы Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які сёлета праводзіўся восьмы раз. Літаральна ўвесь мінулы тыдзень быў насычаны разнастайнымі форумнымі мерапрыемствамі, якія, падтрымліваючы анлайн-фармат, цалкам завалодалі інтэрнэт-прасторай. І вось зараз, адпавядаючы выслоўю «грошы любяць цішыню», разам са старшынёй профільнай камісіі Савета Рэспублікі мы вырашылі падсумаваць вынікі такіх сустрэч.

Так, на думку суразмоўніцы, Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі стаў адным з найважнейшых эканамічных і камунікацыйных праектаў Саюзнай дзяржавы, бо ён дае магчымасць аб'яднаць намаганні кіраўнікоў беларускіх і расійскіх рэгіёнаў, органаў заканадаўчай і выканаўчай улады, экспертаў, дзелавыя колы і моладзь нашых краін.

> У цэлым, тэмпы ўзаемнага гандлю паміж нашымі краінамі, нават пры існуючых ковідных абмежаваннях, вельмі высокія, — упэўнена суразмоўца і ў якасці доказу прыводзіць даныя статыстыкі. — Па выніках чатырох месяцаў бягучага года тавараабарот паміж Беларуссю і Расіяй вырас на 31,9 працэнта. І гэта, вядома, пазітыўны сігнал. З іншага боку, такая станоўчая дынаміка шмат у чым абумоўлена ростам паставак вуглевадароднай сыравіны з Расіі.

— Традыцыйна на гэтым саміце абмяркоўваецца шырокі спектр пытанняў, якія, як правіла, аб'яднаныя агульнай тэмай. Для VIII Форуму рэгіёнаў такой тэмай стала навуковае і тэхнічнае супрацоўніцтва нашых краін ва ўвязцы з працэсамі лічбавізацыі, — нагадала Таццяна Рунец. — Лічым гэты кірунак вельмі актуальным і запатрабаваным, бо сёння фактарам поспеху ў эканоміцы часта становіцца паўнавартаснае супрацоўніцтва ў інавацыйнай сферы і каапераця з іншымі краінамі.

Прычым рэалізацыю сумесных навукова-тэхнічных праектаў у рамках Саюзнай дзяржавы не варта трактаваць як самамэту і спробу адпавядаць модным інтэграцыйным трэндам, перакanana старшыня профільнай камісіі. Яна лічыць, што гэтыя праекты арыентаваны ў першую чаргу на канкрэтныя практычныя вынікі.

У прыватнасці, расійскія спецыялісты стварылі інтэлектуальныя сістэмы кіравання беларускім кар'ерным самазвалам-беспілотнікам БелАЗ. Дзякуючы супрацоўніцтву з расійскімі калегамі ў рамках саюзных праграм створана касмічная групоўка спадарожнікаў. Распрацоўваюцца новыя тэхналогіі хірургічнага лячэння дзяцей з цяжкімі пашкоджаннямі пазваночніка, а таксама тэхналогіі для вытворчасці збалансаваных кармоў жывёл.

## Дзелавы савет — не з нуля

Трэба сказаць, што, акрамя супрацоўніцтва ў навукова-тэхнічнай сферы, на Форуме рэгіёнаў традыцыйна па лініі дзелавых колаў абмяркоўваюцца пытанні двухбаковага супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, прамысловай, інвестыцыйнай сферах. І чарговы форум не стаў выключэннем.

— Відавочна, што сёння, на этапе постковіднага аднаўлення, і дзяржава, і асобна ўзятыя бізнес вырашаюць падобныя задачы — выйсці на траекторыю ўстойлівага росту, эфектыўна і паслядоўна развіваць свае канкурэнтныя перавагі, умацоўваць інавацыйны патэнцыял, — падкрэслівае сенатар.

Яна перакананa, што ў рашэнні гэтых мэтавых задач для суб'ектаў гаспадарання Беларусі і Расіі важную ролю адыгрывае фактар інтэграцыі, напрацаваныя сувязі паміж асобнымі рэгіёнамі нашых краін. Рэалізацыя сумесных праектаў, механізмы падтрымкі каапераціі і ўзаемных інвестыцый — ключавыя ўмовы для паўнавартаснай інтэграцыі і далейшага будаўніцтва Саюзнай дзяржавы. Менавіта гэтыя пытанні сфарміравалі парадак дня пасяджэння савета дзелавога супрацоўніцтва ў рамках VIII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Нагадаем, што на гэтым пасяджэнні гандлёва-прамысловыя палаты Беларусі і Расіі падпісалі пагадненне аб стварэнні Беларуска-расійскага дзелавога савета. Варта адзначыць, што такі савет не ствараецца з нуля. Ён дзейнічаў і раней. Разам з тым з улікам новых выклікаў, умоў працы, напэўна, наспеў час перафарматаваць існуючую структуру, перагледзець яе функцыянал.

Як патлумачыла суразмоўца, асноўныя задачы створанага савета — пашырэнне прамых кантактаў паміж суб'ектамі прадпрымальніцкай дзейнасці, пераадоленне бар'ераў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, поўнафарматны дыялог з органамі заканадаўчай і выканаўчай улады па пытаннях развіцця кааперацыі.

## Устойлівы рост кантрактаў

Безумоўна, важная эканамічная кампанента любога эканамічнага форуму — заключэнне камерцыйных кантрактаў. На VIII Форуме рэгіёнаў падпісаныя кантракты на суму, эквівалентную 800 мільёнам долараў.

Трэба сказаць, што ў кантрактным партфелі апынуліся сельскагаспадарчая тэхніка, прадукцыя машынабудавання, прадукты харчавання, тавары нафтахіміі з высокай дабаўленай вартасцю і іншыя пазіцыі.

Пазітыўны факт заключаецца і ў тым, што сума заключаных кантрактаў ад форуму да форуму ўзрастае. Калі на II Форуме аб'ём здзелак складаў усяго 230 мільёнаў, то на мінулагоднім, які прайшоў у Мінску і Мінскай вобласці, агульная сума кантрактаў ужо дасягала 711 мільёнаў долараў. І гэты паступальны рост працягваецца і надалей. Налета эксперты прагназуюць дасягненне мільярднага рубяжу.

— У цэлым, тэмпы ўзаемнага гандлю паміж нашымі краінамі, нават пры існуючых ковідных абмежаваннях, вельмі высокія, — упэўнена суразмоўца і ў якасці доказу прыводзіць даныя статыстыкі. — Па выніках чатырох месяцаў бягучага года тавараабарот паміж Беларуссю і Расіяй вырас на 31,9 працэнта. І гэта, вядома, пазітыўны сігнал. З іншага боку, такая станоўчая дынаміка шмат у чым абумоўлена ростам паставак вуглевадароднай сыравіны з Расіі.

З пункту гледжання старшыні Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, у рамках Саюзнай дзяржавы гандлёвыя патокі могуць быць больш збалансаванымі, тады і агульная дынаміка ўзаемнага гандлю не будзе залежаць ад цэнавай кан'юнктуры на сыравінных рынках.

Важным з'яўляецца і тое, што для стымулявання развіцця гандлёва-эканамічных адносін і забеспячэння камфортнага бізнес-асяроддзя па выніках Форуму рэгіёнаў урадам дзвюх краін рэкамендавана да канца гэтага года падпісаць міжнародны дагавор аб узаемным прызнанні электроннага подпісу з выкарыстаннем інстытута даверанага трэцяга боку Беларусі і Расіі. Па меркаванні Таццяны Рунец, гэтая ініцыятыва цалкам адпавядае трэнду на лічбавізацыю эканомікі.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» ГЛЯДЗІМ У ПРАМЫМ ЭФІРЫ

**Ужо зусім хутка на вуліцах Віцебска запануе свята творчасці, сяброўства і лета, бо з 15 да 18 ліпеня горад прымае юбілейны XXX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Разам з жыхарамі паўночнай сталіцы і гасцямі свята Белтэлерадыёкампанія таксама завітае на культурны форум, а яшчэ прапануе сваёй аўдыторыі трансляцыі галоўных музычных праграм.**

У інфармацыйных выпусках на тэлеканале «Беларусь 1» увага культурных карэспандэнтаў Агенцтва тэлевізійных навін будзе засяроджана на падзеях фестывалю, якія абяцае сёлета парадаваць публіку насычанай праграмай тэатральных пастановак і кінапаказаў, тэматычнымі экскурсіямі, некалькімі арт-пляцоўкамі і доўгачаканымі выступленнямі любімых артыстаў з розных краін. Раніцы будняў форуму 15 і 16 ліпеня на «першай кнопцы» зробяць па-сапраўднаму добрымі вядучыя шоу «Добрай раніцы, Беларусь!», студыя якога размесціцца непасрэдна ў фестывальнай сталіцы. Рыхтуе каманда і сюрпрызы, адным з якіх стане штодзённы дайджэст «Славянскага базару ў Віцебску» ў выглядзе вячэрніх відэадзённікаў.

Цэнтральны эфірнай падзеяй на «Беларусь 1» будзе серыя трансляцый галоўных канцэртных праграм фестывалю і XXX Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2021». У першы дзень форуму 15 ліпеня на канале пакажуць вялікі гала-канцэрт урачыстага адкрыцця «Базару» з выступленнямі зорак сусветнай велічыні, а 16 ліпеня нас чакае паказ праграмы «Душа народа — песня» святочнага гала-канцэрта «Саюзная дзяржава запрашае...» пры ўдзеле Нацыянальнага акадэмічнага народнага хора Рэспублікі Беларусь імя Г. І. Цітовіча, Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага хора імя М. Я. Пятніцкага ды іншых вакальных калектываў і знакамітых артыстаў.

А 17 ліпеня ў 20.00 гледачы змогуць падтрымаць прадстаўніка нашай краіны на XXX Міжнародным конкурсе выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2021» Данііла Мышкаўца падчас прамой трансляцыі першага дня творчага спаборніцтва. Пачуем праграму «Сусветны хіт» у суправаджэнні шоу-балета Алы Духавай «Todes». На наступны дзень 18 ліпеня прыхільнікаў фестывалю чакае паказ гала-канцэрта майстроў мастацтваў Беларусі «Крок by крок», а ў 22.00 прамая трансляцыя ўрачыстага закрыцця юбілейнага «Славянскага базару» з выступленнямі ўдзельнікаў дарослага міжнароднага конкурсу ў рамках праграмы другога дня творчага спаборніцтва «Славянскі хіт» і ў суправаджэнні Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь.

У эфіры «Беларусь 3» пра ўсе асноўныя падзеі фестывальнага Віцебска будуць распавядаць у праекце «Навіны культуры», а 17 і 18 чэрвеня ў 15.00 увазе аўдыторыі прадставяць выступленні ўдзельнікаў XIX Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск-2021», дзе нашу краіну прадставіць Канстанцін Мазуркевіч. У першы дзень ён выканае песню кампазітара нашай краіны на роднай мове, а ў другі — песню на выбар. А дапоўняць выступленні канкурсантаў нумары харэаграфічных калектываў. І 18 ліпеня тэлеканал пакажа ў прамым эфіры ўрачыстую цырымонію ўзнагароджання пераможцаў дзіцячага конкурсу і гала-канцэрт майстроў эстрады. Таксама на «Беларусь 3» 17 ліпеня ўбачым і паказ адкрыцця культурнага форуму, а 18 ліпеня — канцэртную праграму «Саюзная дзяржава запрашае...».

**Алена ДРАПКО.**

# ШАШКІ
**(«Звязда»)**

**Выпуск № 143**

На дыяграме № 75 унікальная варыянтная кампазіцыя. Выйгрыш дасягаецца як па правілах рускіх шашак, так і па правілах бразільскіх. Але, на жаль, па правілах рускіх шашак рашэнне не ва ўсіх варыянтах бездакорнае.



**№ 75** В. Варушыла
**Белыя простыя шашкі:** g3, d4, c5, e5, a7 (5)
**Чорныя простыя шашкі:** b2, d2, c3, h4, g5, b6 (6)

Наступныя дзве кампазіцыі склаў украінскі гросмайстар шашачнай кампазіцыі Сяргей Юшкевіч (Харкаў).

**№ 76**
**Белыя простыя шашкі:** c1, b2, d2, h2, a3, d6 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** g3, d4, f4, a5, g5, g7 (6)

**№ 77**
**Белыя простыя шашкі:** c1, d2, e3, d4, b6, a7 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** g3, b4, f6, b8, h8 (5)

Наступныя кампазіцыі склаў Генадзь Андрэеў (Латвія) па правілах бразільскіх шашак.

**№ 78**
**Белыя простыя шашкі:** d2, f2, h2, e3, a5, c7 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** c3, b4, f4, h4, g5, g7, b8 (7)

**№ 79**
**Белыя простыя шашкі:** e1, f2, e3, d4, c5, e5 (6)
**Чорныя простыя шашкі:** a3, g3, h4, g5, c7, g7 (6)

**№ 80**
**Белыя простыя шашкі:** d2, f2, c3, e3, b4, c5, g7 (7)
**Чорныя простыя шашкі:** a3, f4, a5, e5, g5, h6, e7, b8 (8)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Празвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

*Праверце свае рашэнні:*
Выпуск № 142 ад 25.06.21.
№ 69 1.b6-c7 d4:d8 2.e3-f4 f6:d4 3.f4-g5 h4:f6 4.f2-g3 h2:f4 5.d6-e7 f8:d6 6.h6:e7 d8:f6 7.a1:g7+
№ 70 1.c7-b8 a7:e7 2.b8-c7 d8:b6 3.f6:e1 h4:d4 4.f4:d2+
№ 71 c3.d8(a:c7) a5.e1(d2) d4(c1) d2.f2x
A(e:c7) e1(d2) d8.h4(e3) g5x
№ 72 1.b4-c5 d6:d2 2.f4:f8 h2:f4 3.c1:g5 h6:f4 4.f8:d8+.
№ 73 1.g3-h4 a5:g3 2.h4:h8 d6:b4 3.b2-c3 b4:d2 4.d4-c5 b6:d4 5.h8:a5+
№ 74 1.g1-f2 a5:g3 2.b2-c3 f4:b4 3.a3:e7 f8:d6 4.h2:f8 d6-e5 5.f8-c5 e5-f4 6.c5-f2+

Першыя дакладныя адказы даслалі С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы, Клімавіцкі р-н, Магілёўская вобл.), В. Дударэвіч (Брэсцкая вобл., Баранавіцкі р-н, в. Новая Мыш), Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі, (усе — Мінск), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзел), У. Панько (Каменец), І. Ананіч (Гродна), В. Ваўчкоў (Маладзечна), С. Лойка (Украіна).

*Пішыце на адрас: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush @yandex.ru.*

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**



ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# Гісторыя з невядомых ракурсаў

**У эфіры «Беларусь 3» на наступным тыдні гледачам прапануюць прагляд некаторых фільмаў з дакументальнага цыкла «Зваротны адлік». Праект распавядае пра малавядомыя падзеі на беларускіх землях і раскрывае пановаму ключавыя эпізоды айчыннай гісторыі. Сёння на рахунку творчай групы студыі гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» ўжо больш за 360 дакументальных карцін, кожная з якіх дае новыя ракурсы і падставы для разважанняў аўдыторыі.**

Кінастужку «Па плане «Д». Як пачыналася сакрэтная вайна» ўбачым у аўторак 13 ліпеня. Нападзенне Германіі на Савецкі Саюз 22 чэрвеня 1941 года стала поўнай нечаканасцю. Дакладных указанняў з Масквы не было, і дзейнасць партыйнага кіраўніцтва Беларусі ў першыя дні вайны была паралізавана. Не было нават плану эвакуацыі Мінска, таму што адступаць ніхто не рыхтаваўся. Але разам з тым у першы ж дзень вайны пад Пінскам сфарміраваўся партызанскі атрад...




У сераду аўдыторыю чакае паказ фільма пад назвай «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі». Ён расказвае пра гісторыі тых, чые лёсы аб'ядналіся жыццём і збегам абставін. Інтэрнацыянальны дзіцячы дом у Іванаве быў адкрыты 1 мая 1933 года. Узяць пад апеку дзяцей, чые бацькі аказаліся ў турмах ці загінулі ў краінах з фашысцкім рэжымам, прапанавала старшыня Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі (МАДР) Алена Стасава. Сродкі на будаўніцтва будынка сабралі працоўныя калектывы Савецкага Саюза, а частку сумы выдзялілі аддзяленні МАДР Германіі, Швейцарыі, Даніі, Нарвегіі і іншых краін. З аднаго боку, інтэрнацыянальны дзіцячы дом быў праявай салідарнасці прадстаўнікоў рабочага руху розных краін, а з іншага — у пэўнай меры дапамагаў савецкай уладзе



кантраляваць замежных партыйных кіраўнікоў — бацькоў і маці тых, хто тут выхоўваўся... І вось 19 чэрвеня 1941 года піянерскі атрад, у якім было 21 дзіця, выехаў з Масквы на адпачынак у беларускае мястэчка Наваельня. На наступны дзень пасля прыбыцця ў санаторый пачалася вайна. Аўтобус, які накіраваўся па дзяцей у лагер, не даехаў да месца прызначэння. А праз пэўны час горад быў акупаваны нямецкімі войскамі...

Фільм рэжысёра Анастасіі Мірашнічэнкі «Яны ўцякалі ад вайны. Беларуская трагедыя» распавядае пра падзеі Першай сусветнай вайны. 2 мая 1915 года ў паўднёвай Польшчы германская армія прарвала фронт і разгарнула наступленне. І калі руская армія стала адступаць, пачался і масавы сыход мірнага насельніцтва.



Тады царскае кіраўніцтва прыняло рашэнне аб масавай эвакуацыі. Войскі атрымалі загад прымяняць тактыку «выпаленай зямлі»: пры адступленні разбураць шляхі зносін, паліць гарады і вёскі. Шматмільённая людская плынь накіравалася на ўсход. І гэта стала катастрофай, паколькі ні кіраўніцтва, ні ваенныя не былі гатовыя да наплыву такой колькасці людзей.

А ў пятніцу тэлеаўдыторыі падрыхтавалі кінастужку ад рэжысёра Наталлі Івановай «Джульбарс і Дзіна. Сабакі службы «Д», якая раскажа пра сабак-дыверсантаў і падрыўнікоў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Пра тое, што гэтых жывёл таксама прызывалі ў армію, мала хто ведае і памятае. Для такіх сабак першы бой станавіўся і апошнім, бо спецыяльна навучаных гадаванцаў адпраўлялі падрываць фашысцкія танкі. Ваенныя кінолагі шлі ў атаку са сваімі чатырохлапымі сябрамі, а вярталіся адны, і нават сэмьі загартаваных вельмі цяжка перажывалі тыя страты. Між тым спецыялісты па дрэсуры імкнуліся прыдумаць, як зрабіць так, каб чатырохногі салдат умеў скінуць са спіны выбуховае прыстасаванне і хутка збегчы. Гісторыю двух сабак-дыверсантаў, якія паказалі сябе падчас «рэйкавай вайны» пад Полацкам, якраз і даведаемся 16 ліпеня на тэлеканале «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з сайта http://bokun.bhc.by.**

# «КУЛЬТУРА» ЗАПРАШАЕ НА КАНЦЭРТ

Напярэдадні XXX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску — 2021» канал «Культура» Беларускага радыё праведзе спецыяльную эфірную акцыю, якая пазнаёміць слухачоў з артыстамі, што прадстаўлялі нашу краіну на дзіцячым і дарослым міжнародных конкурсах выканаўцаў эстраднай песні.

У межах праграмы «Канцэртная зала» з 13 да 16 ліпеня прагучаць запісы фінальных адборачных этапаў, на якіх і вызначыліся прадстаўнікі ад Беларусі — Канстанцін Мазуркевіч і Данііл Мышкавец. Акрамя конкурсных нумароў, гледачы ўбачаць выступленні членаў журы і ганаровых гасцей, сярод якіх — народная артыстка Беларусі Анастасія Масквіна, заслужаныя артысты Беларусі Ірына Дарафеева, Алена Ланская, Вікторыя Алешка, арт-група «Беларусы», ансамбль «Верасы».

Праект «Канцэртная зала» выходзіць у эфір а 19-й гадзіне. Анлайн-вяшчанне даступнае на сайце www.radiokultura.by.

## Беларусь 1

**6.10 Меладрама «Цень зоркі» (16+).**
7.55 Клуб рэдактараў (16+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.40** Гісторыі выратавання (12+).
**10.15** «Зона Х». Вынікі тыдня (16+).
**10.50** Маршрут пабудаваны (12+).
**11.30** «Пытанне нумар адзін».
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35 Серыял «Атэль «Фенікс-2» (16+).**
**14.30** Адзін дзень (12+).
**15.15** Вакол планеты.
**15.55 «Крылы Перамогі». Маст. фільм (12+).**
**16.10 Меладрама «Бестселер па каханні» (12+).**
**18.00** Гала-канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі «Крок by крок».
**21.00** Галоўны эфір.
**21.50** «Славянскі базар у Віцебску».
**22.00** XXX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».
**1.00** Навіны надвор'я.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся. Лепшае за тыдзень» (12+).
**8.00, 19.35** Тэлебарометр.
**8.05 «Клон». Серыял (16+).**
**10.00** «Тры першыя спатканні» (16+).
**10.55** «Паненка-сялянка» (16+).
**11.55** Фільм-біяграфія «Чэмпіёны: Хутчэй. Вышэй. Мацней» (12+).
**13.50** «На нажах» (16+).
**14.50** «Тата папаў» (16+).
**16.45** «Вежа» (12+).
**17.40 Драма «Дзіўнае жыццё Цімаці Грына» (12+).**
**20.05** «Арол і рэшка. Перазагрузка Амерыка» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.20 Меладрама «Пад сонцам Таскані» (16+).**
**23.35** «Калі мы дома-2» (16+).

## Беларусь 3

**7.15** «Царэўна-жабка». Мультфільм (0+).
**7.55** «Святыні Беларусі».
**8.20, 14.40** Навіны культуры.
**8.40, 16.40 «Каралева бензакалонкі». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Багатая бонда.
**10.55** «Нацыянальны хітпарад».
**11.45** «Сваімі словамі».
**12.25 «Па сямейных абставінах». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.00, 18.00** «Славянскі базар у Віцебску-2021». XIX Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск-2021».
**20.15** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** XXX Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».

## Беларусь 5

**7.00, 19.05** На шляху да Токіа-2020.
**7.30, 14.40** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы сярод юніёраў.
**8.35, 12.35, 23.20** Тэніс. WTA.
**10.40, 20.35, 22.35** Футбол. Беларусбанк — Чэмпіянат Беларусі.
**19.35** Вось гэта спорт!
**19.55** На шляху да ЧС-2022.
**20.25** Спорт-цэнтр.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** [СЦ] Нашы навіны.
**7.10** «Здароўе» (16+).
**8.10** «Жыццё іншых» (12+).
**9.10** «Метэагід».
**9.30** «Раніца за вечар наймудрэйшая» (12+).
**10.00 Маст. фільм «Белая ноч, пяшчотная ноч...» (16+)**
**11.50 Серыял «Каханне ў вышку» (16+).**
**15.20, 16.20** Міжнародны музычны фестываль «Белыя ночы Санкт-Пецярбурга» (12+).
**17.20** «Рыгор Лепс. Па нахіленай уверх» (12+).
**18.15** «Тры акорды» (16+).
**20.00** «Контуры».
**21.20** «Цябе чакаюць дома» (12+).
**21.30** «Што? Дзе? Калі?» (16+)
**22.55** «Спартклуб» (16+).
**23.15** Юбілей гурта «Цветы» ў Крамлі (12+).

## СТБ

**6.35, 23.25 «Турысты». Серыял (16+).**
**8.10** Дакументальны праект (16+).
**9.05** «Мінтранс» (16+).
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**11.00, 21.05** Дакументальны спецпраект (16+).
**12.35, 13.40, 16.40 «Карпаў». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**21.55** «Засакрэчаныя спісы» (16+).
**0.55** «Сакрэты старажытных прыгажунь» (16+).

## МІР

**5.00 Маст. фільм «Вясёлыя рабяты» [СЦ] (0+).**
**5.30** Мультфільмы (0+).
**8.50** Праграма «Народжаныя ў СССР». Саюзмультфільм-85 (12+).
**9.25** Праграма «ФазэндаЛайф» (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10 Маст. фільм «Садко» [СЦ] (0+).**
**12.00 Маст. фільм «Чалавек з бульвара Капуцынаў» [СЦ] (12+).**
**14.05, 16.15 Маст. фільм «Прыгоды прынца Фларызеля» [СЦ] (12+).**
**18.30, 0.00** Вынiковая праграма «Разам».
**19.40 Маст. фільм «Красуні» (12+).**
**21.30 Маст. фільм «Како да Шанэль» (16+).**
**1.00** XXX Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2021» (12+).
**2.40 Тэлесерыял «Ганна Герман» [СЦ] (16+).**

## РТР—Беларусь

**7.05 Маст. фільм «Салодкае развітанне Веры» (12+).**
**9.10 Маст. фільм «Кошт кахання» (12+).**
**12.45** «Сто да аднаго».
**13.35** «Вялікая пераробка».
**14.40** «Парад гумару» (16+).
**16.30 Маст. фільм «Хрáні цябе, любоў мая» (12+)**
**20.00** Весткі.
**21.20 Маст. фільм «Дуэль» (12+).**
**23.00** «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.10** «Цела чалавека» (16+).
**6.45** Беларусы (6+).
**7.25** «50 рэцэптаў першага» (12+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Гарады Беларусі» (6+).
**8.45** Адзін дзень (12+).
**9.25** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**10.20** «Кватэрнае пытанне. BY» (12+).
**10.55** «Першая перадача» (16+).
**11.25** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.10** «Дачны адказ» (0+).
**13.10** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.05 Серыял «Дзяржаўная граніца» (12+).**
**15.15, 16.20** «Следства вялі...» (16+)
**19.35 Баявік «Асобнае даручэнне» (16+).**
**21.25** «Зразумець і абясшкодзіць». Аўтарскі праект Алены Даміевай (12+).
**22.00** «Заснавана на рэальных падзеях» (16+).

## 8 канал

**7.00** «Надвор'е».
**7.05** «Мультпарад». «Сезон палявання».
**8.25 Драма «Варашылаўскі стралок» (12+).**
**10.00** «Гатуй як шэф» (12+).
**10.15** Прыгоды «Раман з каменем» (16+).
**12.05** Прыгоды «Жамчужына Ніла» (16+).
**13.50** Дак. фільм «Маніпуляцыя свядомасцю. Лялькі і лялькаводы».
**14.35, 20.00, 21.05, 1.00** «Надвор'е» + «Эрана».
**14.40** Глядзім усёй сям'ёй. «Сонік у кіно» (12+).
**16.20 Дэтэктыў «Кроў на палубе» (16+).**
**19.15** «Суперлато».
**20.05 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы» (16+).**
**20.50** «Вечарніца» (0+).
**21.10 Драма «Рокі-3» (16+).**
**22.50 Вестэрн «Касцяны тамагаўк» (18+).**





## ВТБ

**6.05, 14.20** Раніца з гумарам (16+).
**8.00** Дурні і дарогі (16+).
**9.00** Лаві момант (16+).
**10.20** Зала чакання (16+).
**11.15** Наш рамонт (16+).
**12.00, 23.00** КВЗ. Па-нашаму (16+).
**12.50, 2.55** Серыял «Вароніны» (12+).
**16.20, 2.00** Серыял «Вялікая гульня» (16+).
**17.25** Уральскія пельмені (16+).
**19.00, 20.30** Серыял «Зусім летнія» (16+).
**21.30** Серыял «Дах свету» (16+).
**0.00** Серыял «Мамачкі» (16+).
**1.00** Серыял «Маладзёжка» (16+).
**4.15** Адна за ўсіх (16+).
**5.10** 6 кадраў (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква. Мінулае стагоддзе. Нулявыя.
**7.05** Легенды сусветнага кіно. Ала Ларыёнава.
**7.35, 15.05** «Вялікія гонкі». Дак. фільм.
**8.35** Колер часу. Леанарда да Вінчы.
**8.45, 21.15** «Баязэт». Серыял [СЦ].
**9.30** «Іншыя Раманавы» [СЦ].
**10.15** Лісты з правінцыі. Малакарачаеўскі раён
**10.45** «Паліглот». Нямецкая з нуля за 16 гадзін! № 5.
**11.30** Штучны адбор.
**12.10** Да 100-годдзя Расійскага акадэмічнага Маладзёжнага тэатра. Спектакль «Пушкінскія казкі».
**13.35** «Душа Пецярбурга». Дак. фільм.
**14.30** Год Дастаеўскага. «Жыццё і смерць Дастаеўскага» [СЦ].
**16.00** «Следства вядуць знаўцы». Маст. фільм.
**17.35, 0.55** Міжнародныя музычныя фэсты. Ла Рок Д'Антэрон.
**18.40, 2.00** «Ехаў грэка... Падарожжа па сапраўднай Расіі». Дак. серыял [СЦ].
**19.45** Больш, чым каханне. Яўген Еўтушэнка [СЦ].
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Царская дарога». Дак. фільм [СЦ].
**22.05** Прыстукпі цывілізацыі. «Вялікія гонкі». Дак. фільм
**23.00** «Маналог у 4-х частках. Святлана Кручкова» [СЦ].
**23.50** «Шахеразада». Серыял.
**2.45** Колер часу. Павел Фядотаў.

## Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Варатар».
**7.10, 8.45, 14.20, 15.40, 18.55, 20.20, 21.40, 23.00, 1.20, 2.45, 3.40, 5.30** Музычная настальгія (12+).
**7.25** «Аншлаг! Аншлаг!» 1990 год (12+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Маст. фільм «Яма».
**11.25, 17.15, 5.00** «Блефклуб». 1996 год (16+).
**12.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» з Уладзімірам Глазуновым (12+).
**13.05** Маст. фільм «Печнікі».
**15.00, 21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**16.00** Маст. фільм «Кахаць».
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым «Рэстараная культура». 2005 год (18+).
**19.15** Тэлеспектакль «Міця». 1967 год (16+).
**0.10** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. 2009 год (16+).
**1.35** Фільм-спектакль «Вера».
**4.00** «Колба часу» (16+).

## EuroSport 1

**1.00, 5.30, 12.00, 13.15, 14.15, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Веласпорт. «Тур дэ Франс» (12+).
**2.30** Снукер. Чэмпіянат свету — 2021 (6+).
**4.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Дарога ў Токіа» (12+).
**6.30** Аўтагонкі. World Endurance Championships — 2020 (12+).
**8.30** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс «Зала славы» (12+).
**9.30** Алімпійскія гульні. H2H: Марк Спітц — Майкл Фелпс (12+).
**10.00, 11.00** Веласпорт. «Джыра д'Італія» (12+).
**20.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс Fighting Power (12+).
**21.00** Алімпійскія гульні. Тэлечасопіс Dominating Forces (12+).
**22.00** The Minute (6+).
**22.05** Конны спорт. «Мастэрс» (6+).
**23.05** Усе віды спорту. Фестываль Ekstremsportveko (12+).

## Кінакамедыя

**1.00** Тачка на мільён (18+).
**3.40** Прышэльцы (12+).
**5.35** Чумавыя боты (16+).
**7.35** Паляўнічы на галовы (16+).
**9.40** Самы лепшы дзень (16+).
**11.35** Спявак на вяселлі (12+).
**13.25** Гітлер капут! (16+).
— На сёння гэта вельмі важнае пытанне практычна для ўсіх населеных пунктаў паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Узяць той жа Крычаў. Ёсць новыя мікрараёны, дзе з водазабеспячэннем ніякіх праблем. Але асноўная частка горада карыстаецца старымі сеткамі, якія пабудаваны ў савецкі час. Станцыя абезжалезвання не можа вырашыць праблему, пакуль існуюць старыя сеткі водазабеспячэння. Вада спачатку набывае неабходныя ўласцівасці, але, пакуль бяжыць па старых трубах, амаль цалкам іх страчвае і паступае да спажыўца ў непрыглядным выглядзе. Гэта каласальныя затраты, але праблему трэба вырашаць комплексна з заменай сетак. Інакш якасці вады не дабіцца.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

**Фота з сайта lenadm-mogilev.gov.by**




РАЗГЛЕДЖАНА НА СЕСІІ

# Адказ на «інфекцыйныя выклікі»

**На чарговай сесіі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў галоўным пытаннем была работа арганізацый аховы здароўя ў час распаўсюджвання інфекцыі, выкліканай COVID-19. Аднак гаварылі не толькі пра медыцыну, але і пра ўсё, што звязана з уплывам каранавіруснай інфекцыі на жыццё. Дарэчы, арганізавалі мерапрыемства ў фармаце відэаканферэнцыі.**

Віцебшчына, як вядома, першай прыняла на сябе ўдар з боку COVID-19. І пры гэтым, як падкрэсліў **старшыня аблсавета дэпутатаў Уладзімір ЦЯРЭНЦЬЕЎ,** на поўначы Беларусі годна вытрымалі «выклік». Было арганізавана ўзважанае і рацыянальнае супрацьстаянне. Механізм узаемадзеяння ўлады і службаў, ведамстваў, рэалізацыя комплексу санітарна-эпідэміялагічных мерапрыемстваў аказаліся эфектыўнымі. Лагістыка вызначэння наяўнасці інфекцыі, лячэння і рэабілітацыі адпрацаваныя, і найлепшае перанялі ў іншых абласцях.

**Галоўны ўрач Віцебскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Уладзімір СІНКЕВІЧ** расказаў, што для з'яўлення так званага калектыўнага імунітэту трэба, каб ён быў не меншы за 60 % насельніцтва, а дзеля гэтага вельмі важна рабіць прафілактычныя прышчэпкі.

Уладзімір Цярэнцьеў звярнуў увагу, што ў сістэме адукацыі пакуль што абаранілі сябе і панізілі верагоднасць распаўсюджвання інфекцыі такім чынам меней чым 30 % работнікаў. Таму неабходна, каб да сярэдзіны жніўня (за некалькі тыдняў да пачатку новага навучальнага года) гэты паказчык у прадстаўнікоў педагогікі быў на ўзроўні 75 %. Настаўнікі самі павінны агітаваць сем'і, чые дзеці ў іх вучацца, у неабходнасці зрабіць прышчэпку.

Для параўнання: вакцынацыя работнікаў устаноў сістэмы сацыяльнай абароны перавышае 60 %, медыкаў і фармацэўтаў больш за 70 %.

Трэба разумець, што прафілактычная кампанія панізіць «пандэмічную напружанасць», дазволіць сэканоміць грошы, якія вылучаюцца медыцыне для лячэння. Ды і людзі важна, што людзі, якія не будуць хварэць, змогуць выконваць свае службовыя абавязкі.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Міхаіл ВІШНЯВЕЦКІ** распавёў, што падчас піку так званай першай хвалі пандэміі для інфіцыраваных вылучалася каля 4,2 тысячы ложкаў — 40 % ад усіх, а на сёння гэты паказчык складае прыблізна 1,2 тысячы. Няма ніякіх праблем з забеспячэннем сродкамі абароны медыкаў, лекамі, абсталяваннем, у тым ліку і кіслародный падтрымкі.

Неабходныя аналізы робяць у васьмі лабараторыях (з максімальнай загрузкай да трох тысяч проб), яшчэ адну адкрыюць сёлета ў Браславе. Там праводзяць даследаванне і па выхадных. У поўным аб'ёме задавальняюцца заяўкі на платнае тэсціраванне для ахвотных паехаць за межы Беларусі.

На сесіі акцэнтавалася ўвага на тое, што народным выбраннікам неабходна быць прыкладам для людзей. Падчас сустрэч з выбаршчыкамі, удзелу ў мерапрыемствах, наведвання грамадскіх месцаў трэба прытрымлівацца правілаў бяспекі. Каб распаўсюджванне каранавіруснай інфекцыі было мінімальным, неабходна насіць маску, апрацоўваць рукі антысептыкам і пры магчымасці знаходзіцца на адлегласці ад іншых на паўтара метра. А яшчэ — зрабіць прышчэпку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ДЗЕНЬ СЕЛЬСАВЕТА — ЯКІ ЁН?

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Яшчэ адна ініцыятыва жыхароў аграгарадка Каўпень — добраўпарадкаваць зону вакол новай дзіцячай пляцоўкі, якая з'явілася каля Дома культуры. Гульнёва-спартыўнае абсталяванне на сэканомленыя бюджэтныя сродкі сваімі сіламі набыў сельсавет, людзі жадаюць таксама ўнесці сваю лепту, каб было ўтульна адпачываць з дзецьмі.

Што датычыцца дапамогі ў навядзенні парадку на зямлі — высечка дзікарослай расліннасці, абкошванне населеных пунктаў, прыбіранне несанкцыянаваных звалак, — гэта ажыццяўляюць замацаваныя арганізацыі.

— Не застаюцца без увагі і грамадзянскія могілкі, на пастаяннай аснове праводзіцца санітарная прыборка, — падкрэслівае старшыня Каўпенскага сельвыканкама. На кантролі ўлад — работа па ўліку і скарачэнні колькасці пустых і старых дамоў, будынкаў і збудаванняў. Гэта не толькі пытанне эстэтыкі, але і перш за ўсё бяспекі вяскоўцаў.

— У межах рэалізацыі Указа № 357 на тэрыторыі сельсавета выяўлены і пастаўлены на ўлік 21 пусты дом, з іх чатыры домаўладанні прызнаныя непрыдатнымі для пражывання, па 15 шукаюць спадчыннікаў, на два дамы атрыманы апавяшчэнні аб навядзенні парадку і намеры іх далейшага выкарыстання, — зазначаюць у сельвыканкаме.

Зямельныя ўчасткі, вызваленыя пасля зносу старых домаўладанняў, выдаюцца сем'ям для індывідуальнага будаўніцтва, вядзення асабістай дапаможнай гаспадаркі, агародніцтва. Калі аб'екты, што не выкарыстоўваліся, знаходзяць свайго дбайнага гаспадара, гэта асабліва радуе. Адзін з нядаўніх прыкладаў — адкрыццё ў аграгарадку Каўпень сучаснага гандлёвага аб'екта ў будынку былой сталовай Лоеўскай райспажыўкааперацыі. Хутка ў гэтым населеным пункце з'явіцца новы сучасны вытворчы аб'ект — хлебапякарня.

Забеспячэнне людзей таварамі першай неабходнасці і работа гандлёвых аб'ектаў на вёсцы — таксама на кантролі мясцовых улад. На тэрыторыі сельсавета стацыянарныя гандлёвыя аб'екты працуюць толькі ў трох населеных пунктах. Там, дзе крам няма, жыхароў абслугоўваюць аўталаўкі, якія прыязджаюць дакладна па раскладзе. У вёсках, дарэчы, арганізавана работа перасоўнага аддзялення сувязі, дзе вяскоўцы могуць аплаціць паслугі, атрымліваць і здзяйсняць паштовыя адпраўленні, заказваць тавары. Наладжаны добрыя транспартныя зносіны з раённым цэнтрам.

Між тым сёлета на Лоеўшчыне працягваюць праводзіць мэтанакіраваную работу па выкананні сацыяльных стандартаў. Старшыня райвыканкама Вераніка Байкова і старшыня раённага Савета дэпутатаў Ірына Пастухова звярнулі асаблівую ўвагу на работу сацыяльна значных аб'ектаў на тэрыторыі сельсавета. На іх кантролі — узровень і якасць забеспячэння дзяржаўных сацыяльных стандартаў па абслугоўванні насельніцтва. Дадзены канкрэтныя даручэнні па далейшай рабоце: добраўпарадкаванне тэрыторыі і будынкаў сацыяльна значных аб'ектаў, прывядзенне ў належны стан аўтамабільных дарог. Але не менш важна працягнуць работу і па заахвочванні мясцовага насельніцтва на навядзенне парадку на дваровых тэрыторыях, вакол домаўладанняў.

— Падчас правядзення Дня сельсавета чарговы раз пераконваемся, наколькі важна выбудаваць моцную каманду на вёсцы. Падтрымка павінна ісці і ад намочнікаў старшыні сельвыканкама, старэйшын, мясцовых жыхароў, арганізацый у кожным населеным пункце, бо пытанні добраўпарадкавання заўсёды актуальныя і патрабуюць увагі не толькі камунальных і дарожных службаў, але і саміх жыхароў. Толькі разам мы здольныя дасягнуць станоўчага выніку, — адзначыла Ірына Пастухова. — Перакананa, што ў гэтай рабоце дапамагаюць дыялог з людзьмі, падтрымка і дапамога.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

З НАГОДЫ

# Дастоева, што дало прозвішча класіку

## У аграгарадку Іванаўскага раёна, што на Брэстчыне, рыхтуюцца да 200-годдзя з дня нараджэння Фёдара Дастаеўскага

**Карані роду вялікага рускага пісьменніка Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага — у Дастоеве Іванаўскага раёна. Больш за 500 гадоў таму пінскі князь выдаў грамату на валоданне некалькімі вёскамі на Іванаўшчыне баярыну Данілу Рціщаву. Апошні ўзвёў свой маёнтак у сяле Дастоева. А старэйшаму сыну даў двайное прозвішча Рціщаў-Дастаеўскі ў гонар паселішча. Такім чынам, Дастаеўскі абавязаны Дастоеву прозвішчам, а Дастоева абавязана пісьменніку сваёй вядомасцю.**



Сам класік ніколі не быў у гэтых мясцінах, а вось яго нашчадкі зацікавіліся радзімай продкаў. І паспрыяў такім сустрэчам літаратурна-краязнаўчы музей, які функцыянуе ў школе амаль тры дзесяцігоддзі. Вясной 2007 года ў вёску з С.-Пецярбурга прыязджаў праўнук пісьменніка Дзмітрый Дастаеўскі. Ён перадаў музею цэлы шэраг каштоўных экспанатаў.

Перад святкаваннем 190-годдзя Фёдара Дастаеўскага дзесяць гадоў таму ў музеі была абноўлена экспазіцыя, значна павялічылася плошча музея.




Тады ж Еўразійская эканамічная супольнасць перадала школе поўны збор твораў класіка ў 20 тамах. Сёлета ў лістападзе будзе адзначацца 200-годдзе з дня нараджэння знакамітага пісьменніка. І ў Дастоеве актыўна рыхтуюцца да гэтай падзеі.

Як паведаміў **старшыня Моладаўскага сельскага Савета Сяргей ГРАБАР,** работы па добраўпарадкаванні і паляпшэнні знешняга выгляду населенага пункта вядуцца з вясны. Неўзабаве ў вёсцы адкрыецца кафэ, дзе зможа падсілкавацца любы госць, турыст, падарожнік. Рамонтам і мадэрнізацыяй памяшкання пад пункт грамадскага харчавання займаецца ААТ «Дастоеўскае».

**Яго дырэктар Вадзім ПЕРНАЧ** расказаў, што будынак пад кафэ на баланс гаспадаркі перадало райспажыўтаварыства. Некалі тут быў магазін, потым яго закрылі. А сельгаспрадпрыемства ўзялося за свае сродкі надаць памяшканню новае жыццё. Першых наведвальнікаў, як чакаецца, кафэ прыме ўжо гэтай восенню.

Цэлы памятны комплекс вымалёўваецца на ўездзе ў вёску. Нядаўна ўстанавілі новы паклонны крыж. Тут жа ўзводзіцца невялікая каплічка з іконай Мікалая Цудатворца. А яшчэ вельмі хутка будзе ўстаноўлены памятны знак са словамі Фёдара Дастаеўскага «Жыццё — дар. Жыццё — шчасце».

— Да ўсяго названага патрэбна пляцоўка з сучасным знешнім выглядам і адпаведным добраўпарадкаваннем. Уладкаваннем яе цяпер і займаюцца нашы рабочыя, — расказаў далей Вадзім Пернач. — Яшчэ вядзецца работа па добраўпарадкаванні парку. Тут неўзабаве з'явяцца ліхтары для асвятлення. Для ўпрыгажэння рыхтуюцца новыя архітэктурныя формы, будуць высаджаны дэкаратыўныя дрэвы і кустарнікі.

Пад кіраўніцтвам **старасты вёскі Галіны БУТРЫМ** вясковая грамадскасць рыхтуецца адзначыць юбілей вялікага земляка. Вяскоўцы наводзяць парадак у дварах і абапал іх, уладкоўваюць кветнікі і клумбы.

Ну і, вядома, школа, якая носіць імя пісьменніка, рыхтуецца да знакавай даты. Летась у школе з'явіўся прэсцэнтр. На яго базе запланаваны абласны семінар краязнаўцаў, пройдзе і семінар для настаўнікаў. Музей ужо сёлета стаў арганізатарам раённага конкурсу чытальнікаў і раённай віктарыны «Па мясцінах Дастаеўскага».

— Прэс-цэнтр — гэта, хутчэй, умоўная назва вялікай канферэнц-залы, дзе можна правесці любое мерапрыемства, — расказала **загадчык аддзела культуры Іванаўскага райвыканкама Валянціна БАРАДЗІНЧЫК.** — Асноўным мерапрыемствам святкавання 200-гадовага юбілею класіка стане навукова-практычная канферэнцыя па спадчыне пісьменніка, якая запланавана ў лістападзе ў Дастоева. Згоду на ўдзел у ёй пацвердзілі многія беларускія і расійскія навукоўцы і літаратары. Днямі пройдзе пасяджэнне аргкамітэта па названым мерапрыемстве, будуць вызначаны асноўныя кірункі падрыхтоўкі канферэнцыі. Зараз за кошт раённага бюджэту ідзе абнаўленне будынка школы, дзе размяшчаецца музей Дастаеўскага і названы прэс-цэнтр, — удакладніла Валянціна Андрэеўна. — Вядзецца рамонт даху, абнаўляюцца пэўныя камунікацыі, ва ўсю моц ідзе касметычны рамонт памяшканняў.

Яшчэ суразмоўніца падкрэсліла, што Дастаеўскага памятаюць на Іванаўшчыне, і адзнака яго юбілею не абмяжуецца лістападаўскім мерапрыемствам. Бібліятэкі, іншыя ўстановы культуры, школы праводзяць памятныя імпрэзы з пачатку гэтага года. А яшчэ на Іванаўшчыне жыве надзея, што некалі падобнае святкаванне адбудзецца на аднаўленай сядзібе Дастаеўскіх. Цяпер на тым месцы знаходзіцца толькі памятны знак. А помнік класіку рускай літаратуры стаіць у самым цэнтры вёскі з 1995 года.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ.

Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 8 ліпеня 2021 года.

## Аляксандр МАЦЯС:

# «МЫ НЕ ЎМЕЕМ ЗНАХОДЗІЦЬ ПРЫГОЖАЕ Ў МАЛЫМ»

**Размаўляць пра культуру з любоўю, без ацэнак, але паказваючы аўдыторыі, што беларусам ёсць што любіць, чым ганарыцца і натхняцца — гэта пазіцыя карэспандэнта АНТ Аляксандра Мацяса. Ён не дзеліць людзей па поглядах, але любіць і паважае за прафесіяналізм. Разам з тым перакананы, што культурны і турыстычны патэнцыял Беларусі мае вялікія магчымасці. Пры сустрэчы і распыталі ў Аляксандра пра работу ў тэлежурналістыцы, творчых людзей, малую радзіму і яго асабістыя каштоўнасці.**



У Капылі, на малой радзіме.

### ЦІ ВІДАЦЬ ТВОРЦУ Ў НАТОЎПЕ?

***— З чаго для вас пачынаецца культура?***

— З любові да яе самой. Таму што трэба любіць тое, чым займаешся. Ты павінен размаўляць са сваімі суразмоўцамі не толькі ў тыя хвіліны, пакуль вы запісваеце інтэрв'ю, па прынцыпе «ўбачыліся і да пабачэння». Я імкнуся са сваімі героямі выбудоўваць сяброўскія адносіны. Трэба часам ім патэлефанаваць і пацікавіцца, які ў іх настрой, як здароўе ці проста пагаварыць пра жыццё.

***— Вось цікава, ці адрозніваецца нечым беларускі творчы чалавек у жыцці і ў кадры?***

— Так, перш за ўсё тым, што людзі пачынаюць падбіраць словы. І я вельмі не люблю, калі мяне просяць загадзя даць ім пытанні, каб падрыхтавацца да іх адказы. На гэта я заўсёды кажу: «Я ж буду ў вас пытацца пра тое, у чым вы эксперт». А нашы людзі хочуць нават імправізацыю падрыхтаваць. Я супраць такога.

***— На ваш погляд, чаму так атрымліваецца: недастаткова ўвагі ці проста гэта рамкі, за якія баяцца выйсці: а раптам скажу лішняе?***

— Гэта ментальнасць. І яна сфарміраваная не ў 1990-я і не ў 2000-я гады. Мы ж беларусы, глядзім заўсёды, каб сусед чаго не сказаў і чаго дрэннага не выйшла. Лепш увогуле моўчкі пасядзець. Я ў адной са школак нядаўна сутыкнуўся: дзіця настолькі «настрапалілі», што нельга было пісаць ягоны завучаны расповед. Прашу: раскажы па-свойму. Не, зацяўся, і ўсё...



***— А ці павінен творчы чалавек вылучацца ў натоўпе?***

— Мне здаецца, што творчы чалавек — гэта антаганіст натоўпу. Я, напрыклад, не такі. На масавых мерапрыемствах накшталт «Славянскага базару ў Віцебску», Дня беларускага пісьменства я вельмі хутка стамляюся, і калі шмат людзей вакол і кожны нешта кажа, крычыць, то мне цяжка. У гэтым сэнсе я больш камерны чалавек. Хоць люблю шумныя кампаніі, але толькі не падчас працы. Мне здаецца, творчыя людзі хутка стамляюцца ад патоку інфармацыі, таму такі чалавек не можа быць у натоўпе... Калі ж гаварыць пра знешні выгляд, то тут ужо кожны сам вырашае. Я розных людзей сустракаў. Напрыклад, асацыяцыя з музейнымі супрацоўнікамі, што выгляд у іх такі вінтажны... Але ж так не заўсёды. Не звяртаю ўвагі: вопратка дарагая ці сціплая. Важна, што чалавек кажа, як ён даносіць гэта да гледача, на што падае свой прадмет.

***— Ці заўсёды ўдаецца быць на адной хвалі з суразмоўцамі, бо сустракацца ж даводзіцца з людзьмі розных творчых прафесій?***

— Амаль што. Калі дыялог не складваўся, то гэта здаралася толькі хіба з заезджымі. Таму што беларус з беларусам заўсёды знойдзе паразуменне. А вось несупадзенне часам бывае з «хайпавымі» артыстамі. Ёсць і шмат момантаў, якія застаюцца за кадрам. У мяне, напрыклад, была сітуацыя з адной расійскай спявачкай, калі яна пашкодзіла нагу, і мы былі адзінай камерай, якая тое зняла, але наша каманда засяродзіліся не на падзенні зоркі, а на тым, каб дапамагчы ёй падняцца. І потым на службовым аўто адвезлі яе ў бальніцу...

***— Не сакрэт, што перад любой сустрэчай па рабоце мы, журналісты, рыхтуемся. Як у вас гэта адбываецца?***

— Жонка ўкладвае дачку спаць, а я саджуся за стосік кніг і асвяжаю ў памяці патрэбныя веды. Бо, разумееце, калі сёння ў цябе выстава, а ўчора быў тэатр, а потым фестываль выяўленчага мастацтва, то хоць бы для сябе ты хочаш згадаць нейкія моманты. Самаадукацыя патрэбна. І я ў гэтым плане старамодны чалавек, бо вельмі люблю друкаванае: газета, часопіс, кніга... Кніг тысячы дзве ў мяне ўжо ёсць напэўна. У нататніку я пішу ад рукі. У мяне з дзяцінства добрая зрокавая памяць. Бывала, ва ўніверсітэце ты напішаш «бомбу» і нават не скарыстаешся ёй, але дастаеш білет і бачыш тэкст перад вачыма.

***— Дарэчы, пра кнігі. Вы расказвалі, як з кожнай камандзіроўкі тата прывозіў іх. Які лёс сямейнай бібліятэкі?***

— Часткова яна пераехала са мной, таму што кнігам трэба дзесьці жыць. Я рос і фарміраваўся на розных кнігах. Заўсёды любіў беларускую літаратуру. У школьныя гады здарыўся такі выпадак. У мяне былі адны пяцёркі па літаратуры, а потым нам задалі прачытаць «На ростанях» Якуба Коласа, я пачаў чытаць і пасля пяці старонак зразумеў, што не ідзе мне кніга. Прыйшоў і кажу настаўніку: «Не магу чытаць гэты твор, стаўце двойку». А потым я быў у адпачынку і знайшоў у маці гэтую кнігу. Праглынуў залпам і лічу гэты твор вялікім. Пасля патэлефанаваў у музей Коласа, каб даведацца, ці з'яўляецца Ядвіся рэальным персанажам. Аказваецца, гэта была дзяўчына, якую пісьменнік пакахаў, калі прыехаў у Люсіна. А потым яна засталася па той бок мяжы, і так разышліся іх лёсы.

***— Ці ўдаецца цяпер выкройваць час для чытання, каб менавіта для душы?***

— У асноўным, на жаль, усё ж такі больш чытаю па рабоце. Але ёсць падборачка кніг, якія хачу прачытаць. У Сяргея Астрэйкі зборнік вершаў выйшаў. Мне яго жонка набыла, тым больш што ён мой зямляк. Я маленькую бібліятэчку Капыля збіраю. Не ведаю, як каму, а мне тры Гады малой радзімы пайшлі на карысць. На мяне гэты час паўздзейнічаў сапраўды. Цягне туды.

### КАРЫСНАЕ ЗАПУСЦЕННЕ І АДЧУВАННЕ АПОРЫ

***— Сёлета ў Капылі (на вашай малой радзіме) будзе адзначацца Дзень беларускага пісьменства. Ці ёсць у вас нейкія чаканні?***

— Я люблю Дні беларускага пісьменства, таму што гэта вельмі беларускае свята, тут ёсць беларуская душа. І зноў жа для беларускіх гарадоў гэта шанс быць заўважанымі. Мы часта ў Мінску думаем меркамі МКАД, а за ёй таксама ёсць жыццё. І разумееце, калі твой горад заўважаюць на нацыянальным узроўні і як мінімум год яго назва гучыць усюды, то гэта вельмі шмат значыць для людзей. Нам усім важна ўсведамляць сябе часткай народа, нацыі.

***— Такія святы — гэта яшчэ і магчымасць змяніць умовы жыцця для мясцовых да лепшага... Хоць не абыходзяцца такія дзеянні і без крытыкі...***

— Колькі людзей — столькі і меркаванняў, і гэта нармальна. Усім не дагодзіш, заўсёды знойдзецца той, хто раскрытыкуе любыя дзеянні. А іншы скажа, як добра і прыгожа стала ў гэтым месцы. Мы не ўмеем знаходзіць прыгожае ў маленькім. Я асабіста вельмі люблю бываць у малых гарадах. Там ты знойдзеш, напрыклад, адзіны будынак канца XIX стагоддзя і проста смакуеш тое, што бачыш. Маеш магчымасць уявіць, што там было. У думках дабудоўваеш мястэчка і ўяўляеш, як усё выглядала раней. Маленькія гарады прывабныя тым, што там ты можаш зрабіць для сябе сапраўдныя адкрыцці. Вядома, калі чалавек жыве там увесь час і кожны дзень усё гэта бачыць, то яму можа і нецікава, а ты прыязджаеш, спасцігаеш месца і захапляешся. Шкада, часта ў нас кіруюцца прынцыпам, каб зрабіць прасцей, а з-за гэтага мы страчваем гістарычнае аблічча будынка. І атрымліваецца, што старыя майстры маглі зрабіць больш складана, чым сучасныя рэнаватары. Таму часам умоўнае запусценне ідзе на карысць гістарычнай каштоўнасці.

***— Чаго, на вашу думку, не хапае малым беларускім гарадам?***

— У нас на раёнах прамысловасць і сельская гаспадарка ў прыярытэце, а культура, турызм з нявыкарыстаным патэнцыялам. Напрыклад, я заўсёды кажу, што лёс Капыля — быць горадам-спадарожнікам Нясвіжа. Не хапае маршруту, які б звязаў іх. Так, там аграрны рэгіён, але яго патэнцыял турыстычны, нават калі не браць літаратараў, найвелізарнейшы. Аднак пакуль не створана інфраструктура для турыстаў. Трэба прапрацоўваць брэнд тэрыторыі. Рэгіёны ў плане культурнай разнастайнасці цяпер вырываюцца наперад. І многія інстытуцыі там нават пры адсутнасці вялікіх грошай прапаноўваюць прадукт, які не сорамна паказаць...

***— Вы, як чалавек публічнай прафесіі, знаходзіце ў ёй для сябе больш пераваг ці нейкіх адмоўных момантаў?***

— Я заўжды кантралюю ўласнае меркаванне. Вядома, мой профіль у сацсетках — гэта мая асабістая прастора. Хоць у святле апошніх падзей у мяне там вельмі рэдка з'яўляюцца нейкія рэчы, якія не датычацца працы. І, як правіла, мне пішуць тыя людзі, якім мне ёсць што адказаць. Але я ніколі не ўступаю ў публічную палеміку. Не пішу каментарыяў і не чытаю іх. Мне гэта проста нецікава. Плюс у нашай сям'і ёсць правіла, што мы не публікуем сямейныя фотаздымкі. Не таму, што не хочам, а проста сацсеткі спарадзілі тое, што вельмі размытай стала мяжа паміж асабістым і публічным. Усё ж такі павінна заставацца нешта і для сябе.



З жонкай.

***— Сёння вы больш шчаслівы ў кадры ці па-за ім?***

— Не магу сказаць, што будзе заўтра, але мне падабаецца тое, чым я займаюся і што раблю. У мяне ёсць тая свабода, якую зараз многія шукаюць. І калі былі пэўныя падзеі, то я ні на хвіліну не пашкадаваў, што застаюся на сваім канале. Я не з тых, хто коней мяняе на пераправе. Мы ў адказе і за сваіх калег у тым ліку. Наколькі б ні адрозніваліся нашы погляды. Трэба адзіным фронтам выстаяць, а потым ужо разбяромся, чыя праўда і хто сыдзе, а хто застанецца. Я шчыра ўдзячны, што наш кіраўнік Марат Маркаў змог захаваць калектыў, і наш АНТ выстаяў. З намі размаўлялі, і нас чулі... Але калі спытаць мяне, дзе я больш шчаслівы, то адкажу: «За кадрам». І гэта для мяне нават не параўнальна. Абсалютна спакойна стаўлюся да сваёй прысутнасці на экране. Я працагалік, але разумею, што калі нешта здарыцца, то толькі на родных можна разлічваць.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота з асабістага архіва героя.**

Жыць цікава

# ЦЕСТА ЛЮБІЦЬ РУКІ

## Жанчына пасля 50 стала рамесніцай і спраўдзіла мару ўсяго жыцця

**На майстар-клас да яе нядаўна прыязджала цэлая група хлебапёкаў-аматараў з Мікашэвіч і Лунінца. Святлана КАЛІНОЎСКАЯ з задавальненнем паказвала і расказвала, вучыла жанчын таму, што ўмее сама, чаму ў свой час навучылася ад мамы. Святлана Фёдараўна не з тых майстроў, хто ўтойвае сакрэты і нізавошта не падзеліцца рэцэптам смачнага пірага, яна ўмее частаваць, умее і расказваць, а яшчэ цудоўна спявае, займаецца рукадзеллем і дорыць людзям свае вырабы. Такі вось чалавек-пазітыў, якіх цяпер не часта і сустрэнеш.**



**Святлана КАЛІНОЎСКАЯ (*злева*) разам з сястрой Тамарай БРУХАН за работай.**

### РЭЦЭПТЫ — АД МАМЫ

Пачаткоўцам ад хлебапячэння яна паказвае звычайна свой любімы пірог з тварагом і хлеб з бульбай. Бульбачку папярэдне тушыць да паўгатоўнасці з цыбуляй на алеі, а потым перамяжоўвае тонкімі слаямі цеста. Начынку, паводле яе слоў, раскладваюць па баках і ўсярэдзіне, зашчыпваюць, а затым усю «канструкцыю» выварочваюць, і атрымліваецца гэткі хлебсонца, які доўга не чарсцвее. Але ж галоўны сакрэт майстрыхі заключаецца ў любові да сваёй справы. Святлана часта ўжывала слова «любоў» падчас нашай гутаркі, напрыклад, сказала так: «Мама дала нам столькі любові, што на ўсё жыццё хапае».

Нарадзілася і вырасла Святлана Каліноўская ў вёсцы Любань Лунінецкага раёна. Расказала, што іх у бацькоў было пяцёра. Мама ў 27 гадоў засталася ўдавой, адна ўзнімала дзяцей. Ад цяжкай сельскай работы іншы раз здавалася, што вось-вось упадзе. Але ж тая ніколі не паказвала стомы і вельмі часта балавала дзятву дамашнімі пірагамі, пякла хлеб, пячэнне, пернікі. Малако і масла былі свае, муку і цукар куплялі. У дзяцінстве ўсё выглядала натуральным, у тым ліку мацярынская моц, невычарпальная энергія. Сёння Святлана Фёдараўна разважае, спрабуе ўсвядоміць, што ж давала сілы яе маці — простай вясковай жанчыне. І прыходзіць да высновы, што характар быў закладзены ў дзяцінстве, усё ў асобе чалавека — ад сям'і. У бацькоў Таццяны Канапацкай некалі нарадзілася дзесяць дзяцей. Саму Таццяну маці нарадзіла ў полі, калі пайшла зграбаць сена.

— Тады ў нашых краях былі спрэс балоты. Сена для каровы здабывалі на любым лапіку зямлі. Каб дабрацца да сенакосу, часам трэба было прайсці ледзь не па шыю ў вадзе альбо плыць на лодцы. Вось так і пайшла мая бабуля, цяжарная мамай, па пояс у вадзе, а калі зграбала капы з дзве сена, прыйшоў час нарадзіць. Ну і нарадзіла ў полі. Пад вечар дзед прыехаў па яе і дзіця на лодцы. А па дарозе дадому цікаўныя аднавяскоўкі падзяліліся з ёй навіной: «Ці чула ты, Фядося, што на балоце баба нарадзіла?!» А тая ў адказ: «Не, не чула». Бо пасаромелася прызнацца, а немаўлятка, на шчасце, спала, прыкрытае ручніком, і маму не выдала.

— Дзед быў такі гаспадар, — працягвае Святлана, — што ў 1939-м годзе ледзь не запісалі ў кулакі, выратавала толькі тое, што ніколі не наймаў работнікаў для гаспадаркі, спраўляліся сваёй сям'ёй. А калі прыйшлі немцы, то яго хату як найлепшую ў вёсцы выбралі для размяшчэння афіцэра. Толькі вось «аддзякавалі» акупанты за пастой своеасабліва: пакідаючы вёску, хату спалілі.

### ЗНАЙШЛА СВАЁ

І яшчэ, на што заўсёды звяртала ўвагу маці Святланы, кажучы пра сваё дзяцінства: яе бацькі гадавалі так шмат дзяцей і ніколі паміж сабой не сварыліся. Дзеці не чулі лаянкі ў доме. А вось песні гучалі заўсёды. Усе маміны сёстры пявунні, і яна спявае. Калі пасля інсульту знікла маўленне, здольнасць напяваць засталася. Цяпер маці Святланы, на жаль, не ўстае, не размаўляе, ёй патрэбны пастаянны дагляд.

Апошняе і стала прычынай таго, што Святлана пакінула работу школьнага лабаранта. А потым зарэгістравалася ў якасці рамесніка. Святлана Фёдараўна цяпер займаецца любімай справай усяго жыцця: пячэ хлеб і духмяныя булкі.

У свой час яна працавала і цырульнікам, і, як ужо гаварылася, лабарантам, да любой справы падыходзіла з душой. Калі выйшла замуж, пераехала да мужа ў вёску Чарабасава, потым жылі ў Рэдзігераве. А калі ўжо ў іх сям'і было трое дзяцей, урачы параілі пераязджаць з мясцін, што пацярпелі ад чарнобыльскай аварыі. Тады яны перабраліся ў Высокае.

Але дзе б яна ні жыла і ні працавала, выпечка хлеба была для яе любімай справай. «За гэтай работай думкі нібы выстройваюцца ў адну лінію, прыходзіць у парадак душа. Кажуць, цяжка хлеб мясіць, бо цеста любіць рукі, — разважае Святлана, — але ж я цяжкасці не адчуваю, бо гэта маё».

### СУЦЯШЭННЕ ДЛЯ ЦЕШЧЫ

Дзеці, а іх у Святланы трое, вядома, падтрымліваюць захапленне маці, хоць і не прамінаюць пажартаваць. Сын, бывае, перад выхаднымі тэлефануе, што збіраецца прыехаць, цікавіцца, чым займаецца мама. Калі тая скажа, што будзе булкі пячы, ён парыруе: «Тады мы не паедзем». Бо гэта значыць, што яна будзе вельмі занятая цэлы дзень з ранку да вечара.

А мінскі зяць-святар гаворыць так: «Гэтая работа не рамяство, а суцяшэнне для маёй цешчы». «Няхай сабе і так», — пагаджаецца яна. Бо ў цяперашняй сітуацыі, калі з-за хваробы маці яна прывязаная да дому, рамяством фактычна не зарабляе, у найлепшым выпадку вяртае затрачаныя на выпечку сродкі. Але ж яе прадукцыю ўжо ацанілі многія наведвальнікі абласных і раённых «Дажынак», бывае, замаўляюць пірагі і каравай на вяселле, на юбілеі, іншыя мерапрыемствы — і заўсёды потым дзякуюць за смакату, захапляюцца ўменнем і майстэрствам пекара. А гэта для яе галоўнае.

Рэцэпты выпечкі перайшлі Святлане Каліноўскай ад мамы, тая ў свой час майстэрству навучылася ад маці. Часам нашай гераіні на дапамогу прыходзіць сястра Тамара, якая таксама з задавальненнем становіцца да стала і пліты. Муж падарыў на юбілей яшчэ адну духоўку. Таму цяпер можна паставіць некалькі боханаў адначасова: напрыклад, з арэхамі, з аўсянымі шматкамі, з кунжутам, з кменам, з часнаком. І дом напоўніцца непаўторным, непараўнальным пахам хлеба, без якога ў гэтай сям'і ўжо даўно не абыходзіцца ніводнае свята альбо агульная бяседа. І не толькі ў сям'і. Святлана з задавальненнем частуе сяброў і знаёмых. А яшчэ робіць сваімі рукамі многа розных сувеніраў, напрыклад шые шапкі-каўпакі на каструлі — каб доўга захоўвалася цяпло. Дарэчы, такую рэч можна выкарыстоўваць, калі прадукты трэба засцерагчы ад награвання, напрыклад пры перавозцы.

Творчую жылку яна перадала ў спадчыну дзецям. Дачка Святланы прафесійна займаецца роспісам ікон, сыны Вячаслаў і Сямён у свабодны ад работы час робяць гіпсавыя фігуркі для аздаблення ландшафту. А яна сама паспявае дагледзець хворую маці, падтрымліваць ва ўзорным парадку дом, у якім хоць бы раз на тыдзень абавязкова пахне свежым хлебам.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



**Хлеб з печкі.**

Будзьце здаровыя!

# БУРШТЫНАВЫ ПАКОЙ І МЁРТВАЕ МОРА

## Як пад Любанню ставяць на ногі перахварэлых на COVID-19

**Санаторый «Світанак-Любань» працуе з 1984 года, уваходзіць у сістэму адкрытага акцыянернага таварыства «Белагразздраўніца». Размяшчаецца ўстанова ў сасновым лесе, дзе чысцюткае паветра, маляўнічая прырода. А прырода, як вядома, у сукупнасці з celu рознымі працэдурамі, — найлепшы лекар. У гэтым упэўніліся не толькі беларусы, але і грамадзяне блізкага і далёкага замежжа: Польшчы, Германіі, Швейцарыі, Расіі, Ізраіля. Штогод у санаторыі адпачывае і папраўляе здароўе каля 6-7 тысяч чалавек.**



«Фішка» здраўніцы — мінеральная вада, якая з'яўляецца аналагам трускавецкай. Якасць беларускай вады і яе лекавыя ўласцівасці пацверджаны айчыннымі вучонымі. Сёння гэтая вада запатрабаваная. І людзі, пабываўшы тут аднойчы, вяртаюцца яшчэ і яшчэ. Ёсць пастаянныя кліенты, якія тут лячыліся і адпачывалі па 10—15 разоў.

«Світанне-Любань» з'яўляецца вядучым санаторыем па лячэнні захворванняў нырак, мочакаменнай хваробы, мочавыдзяляльных шляхоў, органаў дыхання і стрававання. Здраўніца ўкамплектавана шырокім спектрам дыягнастычнага і лячэбнага абсталявання, кваліфікаванымі ўрачамі, сярэднім медыцынскім персаналам, якія пастаянна павышаюць прафесійны ўзровень.

У санаторыі пацыенты могуць пакупацца ў вадзе, якая не саступае вядомай вадзе Мёртвага мора. Такога эфекту ўдалося дасягнуць дзякуючы салігорскай солі, канцэнтрацыя якой дасягае тры з паловай кілаграмы на метр квадратны. Знаходжанне ў басейне разгладжвае скуру, нармалізуе работу крывяносных сасудаў, умацоўвае імунітэт, абменныя працэсы арганізма. Другі фактар — гэта азёрная сапрапелевая гразь, якая дае станоўчы эфект пры лячэнні апорна-рухальнага апарату.

— У здраўніцы створаны і сапраўдны бурштынавы пакой. Гэты прыродны матэрыял прывезлі з Калінінграда. Яго не драбнілі, каб захаваць тую энергетыку, якой ён напоўнены. Камяні маюць у саставе бурштынавую кіслату, якая пранікае ў хворыя клеткі чалавека і дабратворна ўплывае на арганізм. Дадзеную методыку ўпершыню прымяніў знакаміты ўрач з Уфы Разіф Рапіеў. Менавіта дзякуючы бурштыну ён здолеў аднавіцца пасля анкалагічнага захворвання, — кажа **намеснік дырэктара па медыцынскай рабоце і харчаванні Віктар СТРУНЕЎСКІ.** — З'явілася і новая працэдура па ўзмацненні мужчынскай палавой функцыі. Усе замежныя госці едуць за гэтымі працэдурамі, улічваючы нашы невысокія цэны.

Рэспубліканскі цэнтр па аздараўленні і санаторна-курортным лячэнні насельніцтва распрацаваў праграму па рэабілітацыі грамадзян, якія перанеслі пнеўманію, асацыіраваную з інфекцыяй COVID-19. У спіс увайшлі 75 арганізацый з профілем «хваробы органаў дыхання». У іх лік увайшоў і санаторый «Світанак-Любань», расказаў Віктар Струнеўскі. За пяць месяцаў у санаторыі аздаравілася каля 250 чалавек, якія перахварэлі на пнеўманію.

Рэабілітацыя дазваляе значна палепшыць як фізічны, так і эмацыянальны стан чалавека, бо захварэць на ковід — гэта заўсёды стрэс. Рэабілітацыйныя мерапрыемствы добра ўплываюць на дыхальную і нервовую сістэмы. Гэтаму дапамагаюць лячэбная фізкультура, дыхальная гімнастыка, інгаляцыя, наведванне салянога пакоя, добрае харчаванне, ужыванне фітачаёў, свежавыціснутых сокаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

**Фота з сайта: rassvet-luban.by**






## БАБА СЕЯЛА ГАРОХ...

Мая блізкая прыяцелька (назавём яе Ніна Барысаўна) жыве ў глыбінцы, у вёсцы...

Зрэшты, не так важна дзе, болей важна як! Удумліва жыве, прыгожа, у працы, у клопатах пра сваю сям'ю, пра сяброў-знаёмых. Для іх яна і звязаць нешта можа, і пашыць, і на гародзе ўласным вырасціць (каб потым раздаць задарма)... Бо такі яна чалавек — душою дабрэнны!

Шкадуе ўсё жывое. А ўжо людзей...

Вось і яны да яе з павагай ставяцца, любяць дапамагчы альбо і проста зайсці, пагутарыць, паглядзець, што ў яе цвіце ды расце...

Прычым вось гэтым неяк сельсавет неяк раз зацікавіўся: сам старшыня яго да Барысаўны зайшоў, па сялібцы пахадзіў, на грады падзівіўся (вачам не паверыў: кавуны растуць!), а следам і таблічку выдаў «Двор узорнага парадку».

«Шчырую я, значыць, на сваіх плантацыях і чую, што брамка ляскае — нехта ідзе да мяне.

Так і ёсць: двое мужчын — прыбраныя, сур'ёзныя... Кажуць, што з міліцыі (ну і няхай, — сама сабе думаю. — Яна ж мая... Мяне беражэ!).

І сапраўды, як у тэлевізары, прадстаўляецца: называе прозвішчы-званні, пытаецца, ці можна мой агарод паглядзець? «Чаму не?! — ім кажу. — Ды калі ласачка!»

А сама зноў жа думаю, што гэта, мусіць, старшыня сельсавета пра кавуны ім расказаў, а яны не паверылі — прыйшлі паглядзець...

Я да той грады і кіруюся, а яны, бачу, не — да кампоснай кучы ідуць. «Што гэта?» — пытае адзін, паказаўшы пальцам на раслінку.

Я яе не садзіла, не сеяла (мусіць, птушкі прынеслі?), але ж — не салгу — бачыла, што расце — пальмачкай і такая ж прыгожая...

Праўду кажучы: каб ведаў, дзе яма, то пераступіў бы.

І я, каб ведала, што гэта раслінка некага зацікавіць, даўно б яе ссекла! А так — бяда: як «госці» мае сказалі, «в наличии факт произрастания и возделывания».

Ну і далей амаль па Петрасяну: калі ў тваім гародзе знайшлі радовішча нафты, то яна, безумоўна, дзяржаўная, а калі сцябліну нейкай каноплі, то яна — твая».

А значыць, уліпла баба! На роўным месцейку!.. Прыйдзецца бажыцца перад гэтымі хлопцамі, што нічога такога не садзіла, не сеяла, што ў мяне — гоні бульбы, грады з капустай, з памідорамі-гуркамі, з гарохам ды кавунамі... І яны ж, гэтыя культуры, не канапелька — самі не растуць: іх «возделывать» трэба.

«Госці», бачу, як быццам, слухаюць, але ж пры гэтым робяць сваё: складаюць пратакол і — хто ж ведае — можа, план свой выконваюць, можа, прэміі зарабляюць?

Потым і мне яшчэ кажуць, каб тлумачэнне пісала, што канапелька гэтая сама насялілася, што ўпэўніцца і што вырошчваць яе я болей не буду».

...Як мая прыяцелька ўсё гэта перажыла, я, калі шчыра, не ведаю! І гэта ж за шчасце яшчэ, што з пратакола ўсё пачалося і ім завяршылася, а калі б не?

...Павучальная гісторыя, ці не так? Барысаўна (праўда, з часам, праз гады) распавядала яе з рогатам, з іроніяй, перасыпала рознымі цытатамі. А што здзіўляла найбольш, — па-ранейшаму шкадавала тую канаплінку-пальмачку!

Як і раслінку гэтую ўвогуле, бо яна ж, гаротніца, ва ўсе часы карыснай была: гектары зямлі пад ёй адводзілі. І чаго ні рабілі — і пажыўны алей, і вяроўкі, і лекі... У садах ад шкоднікаў сеялі, а цяпер...

Усё мяняецца, часам — непазнавальна.

**Марыя Сівец,**

*г. Гродна.*

## КАБ НЕ ТАЯ ЯБЛЫНЬКА...

Для пачатку — трохі гісторыі. Недзе ў 30—40-я гады кіраўнікі кампартыі, каб палепшыць эканамічны стан дзяржавы, пачалі ўводзіць падаткі для дробных уласнікаў, прычым не толькі на кожную сотку зямлі, але і на пладовыя дрэвы.

Значыць, за кожнае з іх даводзілася плаціць... А з чаго, калі вёска была на мяжы выжывання, калі грошай у калгасах не плацілі і за так званыя працадні нічога ніхто не прадавалі?..

Не дзіва, што як толькі пачаўся «абход» ды «перапіс» яблыньгруш, у садах зазвінелі сякеры. Сумнае было відовішча — прыгожыя пладовыя дрэвы ішлі на дровы, на дым...

Карацей, у вяскоўца Макара, калі сад высякаў, аж сэрца крывёй абліваласся!.. Да маленькай яблынькі два дні хадзіў — і з пілкай, і з сякерай... А рука ўсё роўна не слухала — не падымалася: у куце, паміж сліў (і сліўняку) ён прышчапіў тады адмысловы гатунак і ўрэшце вырашыў: «Хай будзе што будзе! Раптам не заўважаць?!»

...І сам ён, можна сказаць, не заўважыў, як прабеглі гады, як адваяваў і больш-менш здаровым вярнуўся з фронту. А дома — вачам не паверыў — з тога кволага дубчыка вырасла дрэва! І такія на ім прыгожыя яблыкі, што вёска ды дзятва, змучаная нястачай ваенных гадоў, налюбавацца не магла! А смялейшыя дык нават красці палезлі.

Макар чалавекам не сквапным быў, разумеў паўгалодных малых. Але ж і свая сям'я далёка не сытая: жонка напраміла бог прасіла, каб ён павартаваў недаспелыя яблыкі, каб было што на Спаса ў царкве пасвяціць...

Лёгка ёй сказаць «павартуй», а як, калі днём трэба ў калгасе працаваць? А ноччу што — дома?

Злаваўся ён на жонку сваю, на зладзюжак, праклінаў тых «разумнікаў», з-за якіх высякалі сады, але ж хадзіў да яблыні.

...Найгорай там было ў дажджы: і ніздзе не адыдзеш, і не схаваешся.

Але ж тут яму бочка на вочы трапіла — дубовая, шырокая, пустая... Макар неяк выцягнуў яе з пуні, закаціў у крапіву непадалёк ад яблыні і ўзрадаваўся: схованка — што трэба! Лёг і любата: паветра свежае, дожджык шуміць, жонка пад бок не штурхае...

Але ж гэта з вечара, а раніцай...

Выйшла яна ў двор і як не самлела: яблычкі абарваныя, зямля здратаваная, а муж яе ў бочцы соладка спіць.

Схапіла жанчына нейкую палку і давай будзіць...

Грукату шмат было! Вёска яго здалёку пачула: пасмяялася з няўдалага вартаўніцтва. І да таго ж даведалася (настаўнік гісторыі расказаў), што адзін філосаф (Дыягенам звалі) у бочцы жыў, а Макар — толькі пераночыў...

Але нават гэтага было дастаткова, каб у вёсцы новая мянушка з'явілася, каб звычайны калгаснік раптам стаў Дыягенам, каб засталіся на зямлі Дыягенавы ўнукі, яго ж сядзіба. А калі пашукаць — хто ведае — можа, знойдзецца і бочка?

**Ніна Кандрашонак,**

*г. Петрыкаў.*

## «СЯДЗІЦЬ — НЯХАЙ СЯДЗІЦЬ: ЕСЦІ НЕ ПРОСІЦЬ...»

Не так даўно нам з жонкай пашчасціла наведаць унікальны музей на калёсах — «Цягнік Перамогі», і я цяпер шчыра кажу: для таго, каб прайсціся па яго вагонах, не шкода было ні грошай, ні часу...

Каля турнікетаў нас сустракалі праваральшчыкі-валанцёры: выдавалі маскі, вымяралі тэмпературу, суправаджалі групы ў вагонах... І тым самым напомнілі мне адну з прыгод.

...Значыць, выпісалі мяне са сталічнай бальніцы. Каб заехаць на вакзал, спускаюся ў метро. На ўваходзе мяне спыняюць: думаю, што з-за вялікай сумкі.

І сапраўды: адводзяць у бок, просяць паставіць яе на адмысловы столік, «прасвечваюць» металашукальнікам, і ён, як ні дзіўна, пішчыць — падае сігнал, што ў сумцы ёсць металічныя рэчы. «Што везяце?» — пытаюць мяне кантралёры. Я спрабую ўспомніць: «Тэпці, ручнік, сподняя бялізна, кніжкі, мыла... Ну што нам яшчэ ў бальніцы трэба?.. З жалеза — як быццам, нічога?» — «Тады дастаньце, — прапаноўваюць мне, — будзем глядзець».

Я да сумкі... І тут жа ўспамінаю, што браў з сабой кубак і лыжку.

Яе — з нержавелай сталі — давялося адшукаць сярод іншых рэчаў, пакласці на стол, пасля чаго мяне з мірам адпусцілі...

«Я вам больш раскажу, — пачуўшы пра гэта, паабяцала адна з жанчын. — Помніце, Патрыярх Кірыл у Мінск прыязджаў? Дык мой дзядуля тады яго пабачыць хацеў — пабыць на сустрэчы. А ўжо ж не малады і Мінск далёка... То мне, студэнцы, сям'я даручыла яго праводзіць.

І вось мы прыязджаем у сталіцу, перад сустрэчай таксама праходзім кантроль. І ў мяне ўсё нармальна, а вось у дзядулі — не: прыбор сігналіць, што ёсць метал. Але ж адкуль, калі ў яго пры сабе аніякіх рэчаў — хіба ў кішэнях?

Дзядуля зняў гадзіннік, папругу, дастаў усё металічнае! А прыбор усё роўна пішчыць! Ад чаго — ніхто не разумее, бо ўсё ж, як быццам, праверылі?!

«Усё ды не ўсё! — усміхаецца раптам дзед. — Я, мае хлопчыкі, успомніў! Ёсць адна жалязяка, але ж яе не пакажаш!» — «Гэта чаму?» — пытаюцца «хлопчыкі». — «А таму, што яна — у сцягне: з часоў вайны там куля сядзіць. Адразу дастаць не выпала — баі цяжкія былі, а потым я сам не захацеў. Няхай, падумаў, сядзіць, раз есці не просіць...»

З той жалезнай куляй, як сказала ўнучка, дзед да скону пражыў. З ёй і пахавалі.

...Гэты распавед-успамін у тым месцы (каля «Цягніка Перамогі») і ў той час быў вельмі дарэчы! Як, зрэшты, у любы і заўжды, бо грэх не помніць нашых мудрых дзядоў.

**Валерый Гаўрыш,**

*г. Чавусы.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

Неасабісты суб'ектыў



# МОРА ГЕРАДОТА

### Дзе можна набрацца незабыўных уражанняў і самых прыемных успамінаў

ХУТКА водпуск, і так хочацца на мора. Уяўляеш яго: то блакітнае, то бутэлечна-зялёнае, як яно плешчацца ад ногі або люлее цябе на хвалях. Часам нават здаецца, што вільготны гарачы вецер прыносіць здалёк яго ледзь улоўны пах... Але яно, мора, сёлета ў жыцці здарыцца наўрад ці. Час неспакойны, лепш пабыць дома. А пра мора можна проста прыемна паўспамінаць, пагартаўшы яркія фотаздымкі. Балазе было яно неадноўчы — і Чорнае, і Азоўскае, і Міжземнае, і Эгейскае, і Адрыятычнае, і Балтыйскае, і Паўночнае... Я ўчора вечарам так і зрабіла — дастала альбомы з фота, паадкрывала папкі на камп'ютары, разглядала, успамінала кожнае сваё лета, калі даводзілася з'язджаць далей за сто кіламетраў ад Мінска ці роднай вёскі. Пасля паспрабавала прааналізаваць і падвесці вынік (пэўна, старэю) — якая з гэтых шматлікіх вандровак запомнілася найбольш, пакінула найяркчэйшыя ўражанні і найбольш момантаў, якія людзі па-простаму называюць шчасцем. І, вы ведаеце, абсалютна нечакана для сябе зрабіла выснову: за ўсе гады мой найлепшы, найцікавейшы, напоўнены самымі яскравымі ўспамінамі водпуск быў на поўдні... роднай краіны, на моры Герадота, якое мы сёння называем Палессем.

ТАДЫ ўсё супала: і адсутнасць магчымасці паехаць кудысьці за мяжу, і нейкі роспачна-самотны настрой, з якім вельмі не хацелася ехаць у родную вёску, і жаданне зрабіць штосьці такое нечакана-адчайнае нават для самой сябе. І такі дарэчны званок былога школьнага настаўніка гісторыі: «Еду пад Петрыкаў на раскопкі. Хочаш са мной, там яшчэ валанцёраў набіраюць...» Ужо праз два дні я трэслася ў ноч у душным плацкарце цягніка Баранавічы — Жытомір да невялікай станцыі Муляраўка, пасля на аўтобусе да Макарычаў — вялікага палескага паселішча, што раскінулася на беразе шырокай павольнай ракі... Кінуўшы ў школьнай спартзале, дзе атабарыліся новаспечаныя археолагі, рукзак і спальны мяшок, памчала на раскоп — вельмі хацелася з усімі пазнаёміцца ды паглядзець, што яно і як.

Прыемна ўразіла ўсё. І кампанія — у асноўным студэнты-старшакурснікі гістфака ды некалькі іншаземцаў (прафесар і дзве яго студэнткі прыехалі аж з Амерыкі). І сама праца: пераціраеш сабе ў пальцах жоўценькі пясок, што выкідваюць хлопцы з раскопу, — і раптам знаходзіш у ім гліняны чарапок, ці кавалак аплаўленай жалезнай руды, ці — вялікая ўдача — бронзавае колца (капалі культуру V стагоддзя — першых вядомых славян). Але галоўным уражаннем была яе вялікасць Прыпяць — ёсць версія, што менавіта гэту паўнаводную шырокую раку падчас вясновага разводдзя і палічыў грэк Герадот морам. Спакойная, рудавата-чырвоная, яна цячэ ў Макарычах, лічы, за агародамі. А раскопкі нашы месціліся крыху далей — на старыку ракі, адкуль наш кіроўца Іванавіч штодня выцягваў па дзесяць-пятнаццаць вялізных самоў. Ён нанізваў іх на лазовы дубец і ў выцягнутай руцэ ўрачыста прад'яўляў нам, падымаючыся ад берага. А вялікія рыбіны плямкалі шырокім ротам і грозна шавялілі вусамі (падобных страшыдлаў я тады ўбачыла ўпершыню).

Наеліся мы тады самяціны — на ўсё жыццё. Асабліва ўпадабалі юшку з галоў ды катлеты — пляскатыя, памерам з далонь, белыя ўсярэдзіне — смаката! Такія вось у нас былі «спартанскія» ўмовы, хутчэй падобныя да санаторскіх. А яшчэ маладая бульба, свежая цыбуля з вялікімі ўжо залацістымі галоўкамі, купленыя на базары ў Мазыры ў бабуль у стракатых хустках, з загарэлымі да цёмна-рудога тварамі і рукамі. У Мазыр плавалі праз Прыпяць на пароме, які цягнуў невялікі кацярок, што раз-пораз гучна чхаў, намерваючыся спыніцца. І гэта таксама была прыгода, бы на здымках гістарычнага фільма, бо дзе ж яшчэ ў апошні год XX стагоддзя можна было пабачыць на пароме разам з машынамі вялікую рахманую карову, трох коз ды бухматы воз з сенам.

МЫ не нашмат адрозніваліся ад тых амерыканцаў, калі, разінуўшыся, з цікавасцю слухалі мясцовую гаворку, сакавітую, не падобную да літаратурнай. Дагэтуль помню: «Нагленны памідор вырас», — казала гаспадыня суседцы, з гонарам паказваючы праз плот той самы «нагленны» памідор, сапраўды, вялізны, больш падобны на гарбуз... Чаўны, самаробныя, вялікія, што туліліся ўздоўж берага, звалі гілярамі. На гэтых гілярах з аднаго берага на другі перавозілі вялікія копы сена... Яшчэ — і гэта самы цёплы ўспамін, адзін з самых важных у жыцці — мясцовая бабуля, у якой пайшлі купіць цыбулі. Яна спачатку прыняла нас за амерыканцаў і паставілася ветліва-насцярожана. Калі ж пачула, што мы з Мінска, радасна пляснула далонямі: «А мае ж вы дзеткі! Дык вы свае!» І завяла нас у хату, і накарміла абедам, і не адпусціла, пакуль не ўзялі ад яе вянок цыбулі — бясплатна (а мы ж хацелі купіць дзве цыбуліны), пакуль не насыпала цэлую торбу чырванабокіх яблык. Памятаю, мы ішлі па вуліцы, смачна грызлі гэтыя яблыкі і разважалі, як добра быць сваім на сваёй зямлі. Для дваццацітрох-дваццаціпяцігадовых гэта было вельмі патрэбнае разуменне, на перспектыву, можна сказаць...

Здзіўляла Прыпяць. Гушкала на сваіх карычневых хвалях, як сапраўднае мора, збірала над сабой цэлае неба белых птушак — нібы менавіта тут была школа лятання для маладых бусloў, «дыміла» шчыльным, бы малако, туманам на досвітках. Калі ж ноччу здаралася навальніца — чарнела і бушавала, а па берагах прыгаломшана кракталі векавыя дубы...

З таго працоўнага адпачынку я прыехала, як трапна сказала мама, «бы галавешка» — пахудзелая і літаральна чорная ад загару. На пытанне, дзе адпачывала, адказвала: «На поўдні», і ўсе зайздросна казалі: «А-а-а». «Роднай Беларусі», — працягвала я. Чамусьці многія не верылі, думалі што жартую.

